РАМАНТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ СНОЎСКАГА ПАЛАЦА 12

ВЯРТАЕМСЯ ЗА ПАРТЫ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЖНІЎНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 161 (29530)

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета рэспублікі:

«Беларускі шлях барацьбы з COVID-19 сябе апраўдаў. Мы практычна ўсе займаліся гэтым пытаннем, паколькі гэта неардынарная сітуацыя, бяда, якая прыйшла ва ўсе краіны свету. І мы разумелі, што з гэтым трэба не проста змагацца, а весці мэтанакіраваную сістэмную работу. Уласна кажучы, так і атрымалася. Магчыма, у нейкіх краінах было апраўдана, калі яны зачыняліся, уводзілі сур'ёзныя каранцінныя меры. Але мы невялікая краіна, і для таго, каб эканамічна выжыць у гэтай сітуацыі, трэба было, каб нашы прадпрыемствы працавалі. І, вядома, мы разумелі, што вельмі правільна зрабілі, што калісьці захавалі санэпідслужбы, якія ўнеслі вельмі сур'ёзны ўклад у гэтую работу. Мы захавалі інфекцыйныя бальніцы. Усё гэта нам дазваляе і сёння працаваць эфектыўна».

Першы раз — у новы клас

У Баранавічах у Дзень ведаў адкрыецца новая школа. Яе пабудавалі ў густанаселеным мікрараёне Бараўкі. Новая школа будзе самай вялікай у горадзе — у гэтым навучальным годзе яна прыме каля 1,7 тысячы школьнікаў. Зараз тут ва ўсю ідзе падрыхтоўка да свята.

На здымку: сярэдняя школа № 1 імя С. Грыцаўца.

Фота БелТА.

КАРОТКА

• Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з начальнікам Службы бяспекі Прэзідэнта. Былі разгледжаны кадравыя пытанні і ўдасканаленне працы.

• На падворку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі за дзень сабралі 45 тон кавуноў і дынь.

• Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс будзе ўведзены ў прамысловую эксплуатацыю з 1 верасня.

• Група ІКАО прыбыла ў Беларусь для расследавання інцыдэнту з рэйсам Ryanair.

• У перспектыве электронны лічбавы подпіс можна будзе выкарыстоўваць навучэнцам.

ISSN 1990 — 763X

Насустрач школе

Тэма першага ўрока — Год народнага адзінства

1 верасня да вучэбных заняткаў у Беларусі прыступяць каля 1 мільёна 85 тысяч навучэнцаў, у тым ліку 118 тысяч першакласнікаў.

У 2021/2022 вучэбным годзе ў краіне будуць функцыянаваць 3762 дзіцячыя дашкольныя ўстановы адукацыі і 2940 дзяржаўных устаноў адукацыі, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі. У 2021 годзе запланаваны ўвод у эксплуатацыю 13 устаноў дашкольнай адукацыі і 6 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

У новым вучэбным годзе ў Мінску будуць працаваць 245 школ і гімназій, у тым ліку дзве новыя ўстановы адукацыі. У Ленінскім раёне сталіцы ў мікрараёне «Лошыца-9» пабудавана сярэдняя школа № 224 з басейнам. Яна разлічана на 1020 навучэнцаў. Яшчэ адна новая сярэдняя школа № 225 размясцілася ў дзіцячым тэхнапарку ў мікрараёне «Магістр». Яе праектная напаўняльнасць — 750 навучэнцаў. Паводле папярэдняй інфармацыі, сталічныя школы ў 2021/2022 вучэбным годзе прымуць каля 212,5 тысячы чалавек, у тым ліку каля 25 тысяч першакласнікаў.

Па традыцыі ў першы школьны дзень у Беларусі пройдзе Дзень ведаў. У гэтым вучэбным годзе тэма першага ўрока «Адзінства беларускага народа — аснова незалежнай краіны» прысвечана Году народнага адзінства.

Міністэрствам адукацыі вызначаны тэрміны навучальных чвэрцяў і канікул у 2021/2022 вучэбным годзе: першая чвэрць — з 1 верасня да 30 кастрычніка 2021 года; другая — з 8 лістапада да 24 снежня 2021 года; трэцяя — з 10 студзеня да 26 сакавіка 2022 года; чацвёртая — з 4 красавіка да 31 мая 2022 года.

На працягу вучэбнага года ўстанаўліваюцца канікулы:
восеньскія (8 дзён) з 31 кастрычніка да 7 лістапада 2021 года ўключна;
зімовыя (16 дзён) з 25 снежня 2021 года да 9 студзеня 2022 года ўключна;
вясенніе (8 дзён) з 27 сакавіка да 3 красавіка 2022 года ўключна.

Для навучэнцаў першых-другіх класаў у ІІІ чвэрці арганізоўваюцца дадатковыя зімовыя канікулы з 14 да 20 лютага 2022 года працягласцю сем дзён.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Моцныя думкі

Аліна ГАРНАСЬКО:

«МЫ ЎСЕ ЛЮДЗІ, І ТРЭБА ЗАЎСЁДЫ ІМІ ЗАСТАВАЦЦА»

Спартсмены — людзі не толькі моцныя целам, але і духам. Спорт вучыць думаць на тры крокі наперад, аналізаваць сітуацыю і прымаць правільныя рашэнні. Таму ў атлетаў ёсць чаму павучыцца, да іх думак варта прыслухоўвацца. У дадзенай рубрыцы «Звязды» мы прапануем даведацца, пра што яны думаюць.

Мастацкая гімнастыка — від спорту, які ніколі не пакіне раўнадушным. Можна ёю захапляцца, крытыкаваць, не разумець яе. Але абыякавы не застаецца ніхто. Асабліва калі гэта датычыцца алімпійскіх спаборніцтваў. Гульні ў Токіа не сталі выключэннем. Адну з гучных сенсацый у японскай сталіцы стварыла Аліна Гарнасько. «Вельмі яркая асоба ў мастацкай гімнастыцы», — так ахарактарызавала сваю вучаніцу алімпійская чэмпіёнка Марына Лобач. Аліна ўпэўнена выканала чатыры практыкаванні ў індывідуальным мнагабор'і і дастойна прайшла праз шматлікія спрэчкі, звязаныя з алімпійскім фіналам у мастацкай гімнастыцы. У такой дзяўчыны адназначна толькі моцныя і цікавыя думкі.

СТАР. 11

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ГЭТА ГІГАНЦКАЕ ПАРАЖЭННЕ ЗАХОДНЯЙ ПАЛІТЫКІ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка назваў сітуацыю ў Афганістане гіганцкім паражэннем заходняй палітыкі і прыкладам таго, да чаго прыводзіць бяздумнае і ўзброенае насаджэнне дэмакратыі. З такой заявай ён выступіў на пазачарговым саміце кіраўнікоў краін Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Нагодай для тэрміновай сустрэчы лідараў стала сітуацыя, якая склалася ў Афганістане пасля захопу ўлады там рухам «Талібан». Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі магчымыя рызыкі для краін-удзельніц, звязаныя з новым раскладам сіл у Афганістане, і ўплыў падзей на бяспеку краін АДКБ. Нагадаем, у АДКБ уваходзіць шэсць членаў — Беларусь, Расія, Арменія, Кыргызстан, Казахстан і Таджыкістан, які мае агульныя граніцы з Афганістанам. Удзел у саміце прыняў таксама Прэзідэнт Узбекістана.

З беларускага боку ў зале, з якой выходзіў у эфір відэаканферэнцыі Аляксандр Лукашэнка, прысутнічалі міністр замежных спраў Уладзімір Макей, дзяржсакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч і першы намеснік міністра абароны Віктар Гулевіч.

Небяспечны пункт на карце

У пачатку свайго выступлення Аляксандр Лукашэнка адрэагаваў на тэзісы Уладзіміра Пуціна, які выступіў раней, і адзначыў, што, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць ад Афганістана, наступствы крызісу там Беларусь адчула адной з першых.

«Верагодна, вы інфармаваны, спецслужбы вашы дакладна інфармавалі: Меркель (канцлер ФРГ. — **«Зв.»**) вам паабяцала, Захад паабяцаў, што ўсіх, хто будзе бегчы з Афганістана, прымуць. Што і адбылося ў апошнія двое-трое сутак. ***Праз Беларусь некалькі дзясяткаў, соцень ужо афганцаў, не іракцаў, не сірыйцаў, менавіта афганцаў, пайшлі туды***. Што зрабілі палякі? Яны адлавілі каля 50 чалавек на тэрыторыі Польшчы, якія, як прызналіся, ішлі ў Германію, і пад пагрозай зброі, страляючы паверх галоў, выцяснулі іх на граніцу з Беларуссю», — паведаміў Прэзідэнт.

Па яго словах, такім чынам Польшча стварыла пагранічны канфлікт з Беларуссю, парушыўшы дзяржаўныя граніцы нашай краіны.

«Сёння мне трэба думаць, што рабіць з гэтымі абяздоленымі людзьмі. Вы чулі і бачылі многія факты, гэта ўвесь свет бачыў, а Захад маўчыць, як яны хворых, цяжарных, паўжывых людзей, выкідваюць на граніцу з Беларуссю, вяртаючы іх назад. Вось іх абяцанні, іх палітыка. Таму, як тут гучала з вуснаў прэзідэнтаў Расіі і Таджыкістана, верыць ім — я перадусім маю на ўвазе Захад — нельга. Яны прайгралі гэту вайну (гэта неабходна ім прызнаць), баязліва адтуль уцяклі», — заўважыў кіраўнік краіны.

Згодна з саюзнымі прынцыпамі, Прэзідэнт Беларусі падтрымаў заяву Уладзіміра Пуціна, што палёты баявых самалётаў ЗША над краінамі АДКБ непрымальныя для ўсіх членаў Арганізацыі.

«Я абсалютна салідарны з ім, што рух НАТА (яны ўжо нахабныя да крайнасці і, зразумела, рухаюцца праз Беларусь на Расію) спрабуе асесці ў Цэнтральнай Азіі. Гэта для Расійскай Федэрацыі і нас непрымальна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Неабходна адкінуць усякія фармальнасці і да саміту ў Душанбэ падрыхтаваць агульную пазіцыю. Пакуль яна выяўляецца, будзем шчырыя, так: «Давайце паглядзім, што будзе далей. А потым будзем сітуацыйна на гэта рэагаваць». Гэта няправільна. Мы будзем глядзець, што будзе далей, але нам неабходна дакладна разумець, што нам неабходна выпрацаваць агульную пазіцыю, а не займацца заклінаннямі і заклікамі, бо спознімся», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, Беларусь, у адрозненне ад Расіі і Таджыкістана, не была актыўна ўцягнутая ў афганскія падзеі. Але ён успамінае выступленні Прэзідэнта Таджыкістана Эмамалі Рахмона, які заўсёды нагадваў, што Афганістан — небяспечны пункт на карце.

«Таму нам неабходна рэагаваць і старацца не перабіраць. ***Мы не ведаем, як будуць развівацца падзеі, але на граніцы Таджыкістана (чытай — АДКБ) з Афганістанам мы спазніліся*** (умацоўваць. — **«Зв.»**), ***давайце прызнаем***. Таму трэба навёрстваць упушчанае», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Усвядомлены крок або палітычная памылка

Аляксандр Лукашэнка сцвярджае: у Беларусі вельмі насцярожана і ўважліва сочаць за тым, што адбываецца ў Афганістане, але сітуацыю неабходна ацэньваць без эмоцый, максімальна рэальна і адэкватна.

«Нам здаецца, што, на першы погляд, гэта гіганцкае паражэнне заходняй палітыкі. Гэта сапраўды так. І перадусім ЗША — адназначны прыклад таго, да чаго прыводзіць бяздумнае і ўзброенае насаджэнне так званых прынцыпаў дэмакратыі. ЗША і іх саюзнікі, як яны часта паступаюць, цалкам па-наплявацельску аднесліся да гістарычных, этнакультурных, рэлігійных асаблівасцяў дзяржаў і, самае галоўнае, да інтарэсаў людзей. Пацвярджэнне таму — тое, што творыцца ў аэрапорце Кабула», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі звяртае ўвагу, што нельга скідваць з рахунку магчымы стратэгічны разлік кааліцыі на чале з Вашынгтонам. Верагодна, іх дзеянні — цалкам усвядомлены крок па стварэнні нестабільнасці ў дадзеным рэгіёне, у зоне адказнасці АДКБ.

«Яны стварылі праблемы, а цяпер перакладаюць іх рашэнне на іншых. Пры гэтым яшчэ і спрабуюць выйсці сухімі з вады. Таму для нас важна было пачуць вашы думкі і ацэнкі, на якія шмат у чым мы таксама будзем арыентавацца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён пералічыў галоўныя пытанні, на якія краіны АДКБ разам павінны адказаць: што будзе далей, якая абстаноўка на знешніх межах АДКБ, якія першачарговыя і наступныя крокі вымушаны распачаць па нейтралізацыі пагроз? І гэтыя крокі, па словах Прэзідэнта, павінны вызначыць да сустрэчы ў Душанбэ.

Што непрымальна ні для Расіі, ні для АДКБ?

Яшчэ адно адчувальнае пытанне, нагадаў кіраўнік Беларусі, звязанае з выходам ЗША з Афганістана — магчымыя планы аб размяшчэнні ўзброеных кантынгентаў амерыканскай арміі ў суседніх краінах, у тым ліку членах АДКБ.

«Як бачыце, тут пазіцыя Беларусі супала з расійскай пазіцыяй. Мяркую, што гэтая тэма таксама заслугоўвае ўважлівага вывучэння з пункту гледжання бяспекі ў зоне адказнасці нашай Арганізацыі. Яшчэ раз падкрэслю: падтрымліваю Прэзідэнта Пуціна ў тым, што непрымальна ні для Расіі, ні для АДКБ размяшчэнне войскаў ЗША і кааліцыйных войскаў у суседніх краінах, не толькі на тэрыторыі краін АДКБ», — паўтарыў Аляксандр Лукашэнка.

Выбудоўваць абарону граніц

Прэзідэнт звярнуўся да праблемы бежанцаў і мігрантаў — цалкам дакладна, што да патокаў з разбураных Сірыі, Ірака і Лівіі дадаліся людзі з Афганістана.

«Нават калі яны ў канчатковым выніку накіруюцца на Захад, яны будуць ісці і ляцець праз нас», — паведаміў кіраўнік Беларусі.

З тэрарызмам, на яго думку, наўпрост звязаныя рызыкі трансграничнай злачыннасці, незаконнага абароту наркотыкаў і зброі, якія будуць узрастаць.

«Улічваючы пэўную празрыстасць граніц паміж нашымі краінамі, гэтае пытанне нас таксама сур'ёзна турбуе. У дадзеным кантэксце неабходна ўдзяліць увагу практычным мерам па далейшым умацаванні таджыкска-афганскай граніцы. Гэта тое, што нам неабходна зрабіць у першачарговым парадку», — заўважыў Прэзідэнт Беларусі.

Ён прапанаваў разгледзець пытанне аб правядзенні ў рамках АДКБ пазачарговых міждзяржаўных аперацый «Канал» (барацьба з наркатрафікам) і «Нелегал» (супрацьдзеянне нелегальнай міграцыі), а ў ходзе маючых адбыцца 18—23 кастрычніка ў Таджыкістане вучэнняў АДКБ «Узаемадзеянне-2021», «Пошук-2021, «Эшалон-2021» адпрацаваць пытанні процідзеяння актуальным пагрозам з афганскага напрамку.

«Пры гэтым мы не збіраемся шантажыраваць Афганістан, сённяшнія ўлады, талібаў — не. Мы проста выбудоўваем абарону нашых рубяжоў АДКБ на ўсялікі выпадак», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Не лічыцца з пазіцыяй АДКБ, ШАС немагчыма

Яшчэ адно пытанне, якое закрануў кіраўнік Беларусі, звязана з дыпламатычнымі намаганнямі талібаў. Яны імкнуцца ўсталяваць іх з ключавымі сусветнымі і рэгіянальнымі гульцамі, а шэраг краін ужо схіляецца да прызнання руху.

«Для нашай Арганізацыі важна выразна разумець, наколькі такія перспектывы рэальныя і якая павінна быць наша пазіцыя ў гэтым выпадку. Мы вельмі разлічваем на тое, што Прэзідэнт Расіі, як заўсёды своечасова, праінфармуе нас аб сваёй пазіцыі. Расія — гэта не проста адзін з ключавых гульцоў у гэтай праблеме. Гэта самы галоўны гулец. Ад Расіі будзе вельмі шмат залежыць у саюзе з цэнтральнаазіяцкімі рэспублікамі», — сцвярджае Прэзідэнт Беларусі.

«Таму добра, што ў Душанбэ адбудзецца і нарада Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. ***Варта ўзмацніць узаемадзеянне па лініі АДКБ і ШАС***, выкарыстоўваючы для гэтага саміты дзвюх арганізацый, запланаваныя на 16—17 верасня ў Душанбэ. Магчыма, прапрацаваўшы гэтае пытанне, мы выйдзем на сумеснае пасяджэнне па праблематыцы афганскага ўрэгулявання», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта Беларусі, пазіцыя дзвюх арганізацый у гэтай сітуацыі будзе важнейшай, чым пазіцыя заходняй кааліцыі.

У завяршэнне Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў АДКБ распрацаваны ўсе неабходныя планы, падпісаныя дакументы. Для прыняцця і рэалізацыі рашэнняў інструментаў дастаткова.

«Хачу запэўніць усіх вас, што ***мы абавязкова, хоць геаграфічна і не мяжуем з Афганістанам, будзем ісці ў адпаведнасці з узгодненай, агульнай пазіцыяй у рамках АДКБ***. Іншага не дадзена», — рэзюмаваў Прэзідэнт Беларусі.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Пасля пазачарговай сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ генеральны сакратар Арганізацыі Станіслаў ЗАСЬ расказаў на брыфінгу пра вынікі перагавораў.

Станіслаў Зась звярнуў увагу, што лідары краін АДКБ выказаліся за неабходнасць прыняць дадатковыя меры па ўмацаванні бяспекі дзяржаў-членаў арганізацыі, а кансалідаваная пазіцыя дзяржаў АДКБ па сітуацыі ў Афганістане будзе выпрацавана ў найбліжэйшы час.

«У ходзе сённяшняга абмеркавання была выказана неабходнасць у сувязі з сітуацыяй у Афганістане і яе пагаршэннем распачаць дадатковыя меры па ўмацненні бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ, перш за ўсё Цэнтральна-Азіяцкага рэгіёна», — перадае словы генсека АДКБ ТАСС.

Паводле слоў Станіслава Зася, у высновах, якія прагучалі ў ходзе сесіі, адзначалася: імклівы і непадрыхтаваны сыход з Афганістана войскаў ЗША і саюзнікаў па кааліцыі вядзе да дэградацыі абстаноўкі, павышэння пагрозы бяспекі Цэнтральна-Азіяцкага рэгіёна, а ў доўгатэрміновай перспектыве і міжнароднаму міру і стабільнасці.

Як перадае словы Станіслава Зася ТАСС, краіны АДКБ на пазачарговай сесіі дамовіліся ў найбліжэйшы час выпрацаваць сумесную заяву па сітуацыі ў Афганістане на ўзроўні кіраўнікоў МЗС.

«Сёння ў ходзе абмеркавання была выказана такая думка кіраўнікамі нашых дзяржаў, што неабходна ў кароткія тэрміны сфарміраваць узгодненую пазіцыю АДКБ па той сітуацыі, якая цяпер складваецца ў Афганістане і вакол Афганістана. Мы такую работу правядзём у найбліжэйшы час. На сесіі (Савета АДКБ. — ***«Зв.»***), якая пройдзе 15—16 верасня, мы будзем рыхтаваць сумесную заяву на ўзроўні міністраў замежных спраў аб сітуацыі ў Афганістане, у якой будзе выказана кансалідаваная пазіцыя ўсіх нашых дзяржаў», — адзначыў Станіслаў Зась.

Генеральны сакратар АДКБ пацвердзіў гатоўнасць АДКБ да дыялогу з НАТА па сітуацыі ў Афганістане.

«Калі казаць аб узаемадзеянні з НАТА, то мы досыць даўно выказвалі гатоўнасць, і на ўзроўні міністраў замежных спраў, да развіцця ўзаемадзеяння з НАТА па ўсіх актуальных для нашых арганізацый пытаннях, у тым ліку па Афганістане, — сказаў Станіслаў Зась. — На жаль, з боку дзяржаў НАТА такой гатоўнасці не праяўлена. Таму зараз казаць пра нейкія крокі не мае сэнсу».

Акрамя таго, Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў найбліжэйшы час мае намер разгледзець тэму бежанцаў з Афганістана.

Жніво-2021

На чарзе — уборка грэчкі

А па збожжы тры вобласці дасягнулі мільённых паказчыкаў

У Беларусі пачалася ўборка грэчкі, паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Па даных на ўчарашні дзень, яна была ўбрана з 0,15 тысячы гектараў, што складае 0,49 працэнта ад плана.

Між тым у цэлым збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы) убраны з 2,032 мільёна гектараў, што складае 95,8 працэнта запланаванай плошчы. Намалочана 6,204 мільёна тон збожжа. Па намалоце лідзіруе Мінская вобласць — больш за 1,5 мільёна тон збожжа, далей ідуць Брэсцкая вобласць — каля 1,2 мільёна тон, Гродзенская — больш за 1 мільён тон, у Магілёўскай намалочана 846,6 тысячы тон, у Гомельскай — 774 тысячы тон, у Віцебскай — 758,4 тысячы тон.

Дзяржзаказ па збожжы выкананы на 86,2 працэнта, пастаўлена 716,8 тысячы тон.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДА АДЗІНАЙ ГУМАНІТАРНАЙ ПРАСТОРЫ

У праграме мерапрыемстваў XXVIII Дня беларускага пісьменства ў Капылі знакавым абяцае быць міжнародны круглы стол «Пісьменнік і адзіная гуманітарная прастора». Праўда, у фармаце анлайн ён збярэ прадстаўнікоў самых розных краін яшчэ 3 верасня, напярэдадні свята прыгожага пісьменства. Пра тое, якім мяркуецца быць анлайн-круглы стол, і гаварылі на прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы арганізатары і патэнцыяльныя ўдзельнікі актуальнай дыскусійнай пляцоўкі.

Фота Алены МАЗАВЕЦ

Намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар БУЗОЎСКІ акрэсліў вартасці той размовы, якая павінна выходзіць за рамкі выключна літаратурна-мастацкіх праблем. Ён заўважыў, што літаратура тады нечага вартая, калі закранае інтарэсы ўсяго грамадства, калі мастацкае слова спрыяе ўсталяванню галоўных прыярытэтаў сацыяльнага, гуманістычнага развіцця. І ў такім разе відавочна, што ўдзельнічаць у будучай вераснёўскай дыскусіі павінны і палітолагі, аналітыкі, сацыёлагі, гісторыкі — аўтары знакавых кніг, да якіх ёсць зацікаўленасць грамадства, шырокага кола чытачоў.

Пра міжнародныя стасункі Саюза пісьменнікаў Беларусі досыць падрабязна распавёў старшыня праўлення творчай арганізацыі Мікалай ЧАРГІНЕЦ. Дарэчы, у прафесійнай пісьменніцкай супольнасці нашай краіны заключаны пагадненні з 39 нацыянальнымі пісьменніцкамі арганізацыямі свету. А творы беларускіх пісьменнікаў у апошнія гады перакладзены болей як на 20 моў свету. Вядомы ў Беларусі і за яе межамі палітолаг, публіцыст Сяргей МУСІЕНКА назваў канкрэтных удзельнікаў будучай размовы 3 верасня. Адметна, што сярод іх — савецкі і ўкраінскі гісторык, археолаг, акадэмік НАН Украіны Пётр Талочка, намеснік дырэктара маскоўскага выдавецтва «Молодая гвардия» Раман Касыгін, расійскі журналіст і пісьменнік, аўтар кнігі «Фідэль Кастра» ў папулярнай серыі «Жыццё знакамітых людзей» Максім Макарычаў, іншыя вядомыя медыйныя асобы.

Сярод удзельнікаў прэс-канферэнцыі — дацэнт кафедры палітычнай тэорыі МДІМЗ Міністэрства замежных спраў Расійскай Федэрацыі, кандыдат палітычных навук Кірыл КОКТЫШ. Ён — часты госць у Беларусі, уважліва сочыць і за палітыка-эканамічнай сітуацыяй у свеце, у прыватнасці ў Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне, краінах Азіі. Кірыл Яўгенавіч гаварыў пра тое, што падзеі літаральна апошніх дзён пацвердзілі страту ранейшых каштоўнасцяў, якія нам усім навязвалі краіны-дыктатары, той палітычны свет, які лічыць свае правілы суіснавання адзіна правільнымі.

Удзел у прэс-канферэнцыі прынялі таксама старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК, журналіст газеты «СБ. Беларусь сегодня» Андрэй МУКАВОЗЧЫК.

Несумненна, размова за круглым сталом у фармаце анлайн, якая адбудзецца 3 верасня, пакажа і нашы, беларускія, прыярытэты сацыяльнага, гуманістычнага развіцця і дазволіць пачуць здаровыя меркаванні многіх аўтарытэтных асоб у галіне літаратуры, культуры, палітычнай публіцыстыкі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Надвор'е

ПРАХАЛОДНАЕ І ДАЖДЖЛІВАЕ

Такім яно чакаецца ў краіне на тыдні

Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Новы тыдзень у краіне пачынаецца з прахалоднага надвор'я ў вобласці павышанага атмасфернага ціску.

У аўторак, 24 жніўня, умовы надвор'я на поўдні Беларусі будуць вызначацца ўплывам маларухомага атмасфернага фронту. У гэтай частцы краіны чакаецца пахмурнае і дажджлівае надвор'е. У многіх раёнах Брэсцкай і Гомельскай абласцей пройдуць моцныя дажджы. У паўночных і цэнтральных раёнах Беларусі, дзе адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, ападкі малаверагодныя. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—11 градусаў вышэй за нуль, па поўдні да плюс 13. Днём будзе 14—20 градусаў цяпла, месцамі да плюс 22.

У сераду, 25 жніўня, пераважна па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах Гомельскай вобласці чакаюцца моцныя дажджы. Захаваецца халаднаватае надвор'е: ноччу будзе ад плюс 3 па поўначы да 14 градусаў вышэй за нуль па паўднёвым усходзе краіны. Днём у асноўным 14—19 градусаў цяпла, месцамі паветра можа прагрэцца да плюс 21.

У чацвер, 26 жніўня, адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў. Месцамі, пераважна па захадзе і ўсходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 градусаў вышэй за нуль, месцамі да плюс 14. Днём будзе 13—20 градусаў цяпла, месцамі, пераважна па паўднёвым усходзе, да плюс 22.

У другой палове тыдня ўмовы надвор'я будуць вызначацца ўплывам атмасферных франтоў ад цыклону з цэнтрам над поўднем Балтыйскага мора. На большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы рознай інтэнсіўнасці. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—14 градусаў вышэй за нуль, днём будзе ад плюс 13 па паўночным захадзе да 25 градусаў цяпла па ўсходзе краіны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Захрас у балоце

У 22.05 да ратавальнікаў па дапамогу звярнуўся мужчына, які паведаміў, што захрас у балоцістай мясцовасці ў раёне Варшаўскай шашы ў Брэсце, паведамляе МНС.

Як высветлілася, грамадзянін ішоў у бок дому. Вырашыў скараціць шлях па балоцістай мясцовасці, захрас і самастойна выбрацца не змог, паведамляе падрабязнасці здарэння МНС.

Да месца выкліку неадкладна былі накіраваныя падраздзяленні МНС і службы ўзаемадзеяння. Пацярпелага выявілі за 150 метраў ад дарогі: мужчына знаходзіўся ў балоце па пояс і прасіў аб дапамозе. Яго выцягнулі пры дапамозе падручных матэрыялаў — галін дрэва.

Выратаваны мужчына быў агледжаны медыцынскімі работнікамі. У шпіталізацыі не меў патрэбы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні карэспандэнту газеты «Звязда» Нэлі Зігулі з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.

Бяспечная праца

ВАЖНА ПАПЯРЭДЗІЦЬ НЯШЧАСНЫЯ ВЫПАДКІ

Больш за 20 службовых асоб сельгасарганізацый прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні патрабаванняў аховы працы, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

У мэтах забеспячэння належных умоў працы работнікаў сельскагаспадарчых арганізацый падчас уборачнай кампаніі з 1 ліпеня бягучага года Дэпартаментам дзяржаўнай інспекцыі працы пры правядзенні наглядных мерапрыемстваў у 66 сельгасарганізацыях спынена звыш 1,7 тысячы парушэнняў патрабаванняў аховы працы.

З-за парушэнняў эксплуатацыі вытворчага абсталявання, якія маглі прывесці да няшчасных выпадкаў з работнікамі, прыпынялася работа 104 машын і механізмаў, а таксама чатыры вытворчыя участкі.

Па патрабаванні дзяржаўных інспектараў з-за непрымянення неабходных сродкаў індывідуальнай абароны, непраходжання медыцынскіх аглядаў, навучання і інструктажу па ахове працы часова адхілены ад працы 197 работнікаў да ліквідацыі парушэнняў.

За дапушчаныя парушэнні аштрафавана 21 службовая асоба сельскагаспадарчых арганізацый.

У мэтах прафілактыкі траўмавання работнікаў мабільнымі групамі (гэта групы, якія створаны для аказання практычнай і метадычнай дапамогі арганізацыям, якія размешчаны на падведамаснай тэрыторыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, для забеспячэння выканання заканадаўства аб ахове працы, прафілактыкі вытворчага траўматызму, аператыўнага выяўлення і ліквідацыі парушэнняў патрабаванняў бяспекі) абследавана 419 сельскагаспадарчых арганізацый.

Ім рэкамендавана ліквідаваць звыш 4,4 тысячы парушэнняў патрабаванняў бяспекі. З-за грубых парушэнняў аховы працы па рэкамендацыях мабільных груп часова прыпынялася эксплуатацыя 132 машын і механізмаў і тры вытворчыя ўчасткі, адхілены ад працы 244 працаўнікі.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Папа Рымскі Францыск можа адмовіцца ад прастола

Папа Рымскі Францыск, якому ў снежні споўніцца 85 гадоў, можа па прыкладзе свайго папярэдніка Бенедыкта XVI адрачыся ад Апостальскага прастола, паведамляюць РІА Навіны.

Прычынай магчымага рашэння папы Францыска СМІ называюць стан здароўя пантыфіка, якому 4 ліпеня ў Рыме была праведзена хірургічная аперацыя на кішэчніку.

«У Ватыкане ўсё больш настойліва гавораць аб новым канклаве. Паводле гэтых сцвярджэнняў, папа Францыск выказаў намер сысці. У будучым снежні, дарэчы, яму споўніцца 85 гадоў — столькі ж, колькі было Бенедыкту XVI на момант адрачэння», — піша італьянская газета Libero.

«Аднак прычынай адрачэння Бергольа стаў бы не столькі ўзрост, колькі стан здароўя, які аказаўся ў цэнтры ўсеагульнай увагі нечаканым і непрадказальным чынам у сувязі з хірургічнай аперацыяй», — адзначае выданне.

Папа Бенедыкт XVI на кансісторыі 11 лютага 2013 года нечакана абвясціў пра сваё рашэнне адрачыся ад Апостальскага прастола. Вечарам 28 лютага гэтае рашэнне ўступіла ў законную сілу. Сёння Бенедыкт, Папа Рымскі, пражывае ў маленькім манастыры Mater Ecclesiae ў Ватыкане.

Транзітная галіна Латвіі занепакоеная санкцыямі супраць Беларусі

Транзітная галіна Латвіі заклапочана ўведзенымі супраць Беларусі санкцыямі, якія яшчэ мацней памяншаюць грузапаток праз парты балтыйскай рэспублікі. Пра гэта заявіў выканаўчы дырэктар «Балтыйскай асацыяцыі — транзіт і лагістыка» Іварс Ландманіс, паведамляе ТАСС са спасылкай на латвійскае інфармацыйнае агенцтва LETA.

Па словах дырэктара, латвійскім кампаніям дазваляецца працаваць з беларускімі толькі ў рамках існуючых дагавораў, але нельга заключаць новыя. «Напрыклад, нафтапрадукты: у некалькіх латвійскіх тэрміналаў іншай альтэрнатывы няма. Мы ведаем, што Расія ўжо некалькі гадоў таму скараціла патокі ў Латвію, а зараз і беларускія нафтапрадукты трапілі пад санкцыі, і ўсё», — сказаў ён.

Іварс Ландманіс падкрэсліў, што партовая транзітная галіна Латвіі ўскладала вялікія надзеі на беларускія грузы. «Раней мы ездзілі, спрабавалі ўмацаваць адносіны, але цяпер усё гэта пастаўлена на паўзу. Няма падтрымкі і ў тым, як мы маглі б змяніць гэты напрамак», — адзначыў ён, дадаўшы, што прапускная здольнасць тэрміналаў высокая, а такой колькасці грузаў энергарэсурсаў, як было раней, больш няма. У латвійскіх партах за першыя сем месяцаў гэтага года апрацавана 23,327 млн тон грузаў, што на 10,6 % менш, чым за адпаведны перыяд мінулага года.

Выканаўчы дырэктар асацыяцыі таксама ўказаў, што ў прадпрымальнікаў няма фінансавання для змены свайго віду дзейнасці, і галіна спрабуе каапераваць і думаць аб агульных стратэгіях развіцця.

ЕС не бачыць Украіну членам саюза ў найбліжэйшыя гады

Віцэ-прэзідэнт Еўракамісіі Валдзіс Дамброўскіс заявіў, што не бачыць Украіну ў Еўрапейскім саюзе ў найбліжэйшыя гады, паведамляе РБК-Украіна.

Паводле яго слоў, ЕС падтрымлівае работу Украіны па больш цеснай інтэграцыі. «Што датычыцца ўступлення ў ЕС, гэта ў першую чаргу палітычнае пытанне, якое павінна аднагалосна быць падтрымана ўсімі краінамі-членамі, — адкрыццё новых перагавораў аб уступленні. І ўжо ў рамках гэтага працэсу перагавораў з'яўляецца дарожная карта», — заявіў ён.

На пытанне аб тым, ці магчымы ў найбліжэйшыя тры-пяць гадоў запуск працэдуры членства Украіны ў ЕС, Валдзіс Дамброўскіс адказаў: «Я так думаю, з улікам палітычнай сітуацыі ў ЕС, таго, як праходзяць пытанні па пашырэнні, то, думаю, што, на жаль, гэта (членства Украіны ў ЕС) малаверагодна ў найбліжэйшыя гады».

Расклад на паслязаўтра

БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА: КУРС НА БУДУЧЫНЮ

На Рэспубліканскім педсавеце расставяць кропкі над «і»

У нацыянальнай сістэме адукацыі ёсць добрая традыцыя — напярэдадні новага навучальнага года праводзіць жнівеньскія нарады педагагічных работнікаў, падчас якіх актуалізуюцца асноўныя напрамкі работы, удакладняюцца падыходы ў вырашэнні надзённых задач, абагульняецца назапашаны вопыт. Не стаў выключэннем і гэты жнівень. У канцы месяца педагагічныя саветы адбудуцца ва ўсіх рэгіёнах краіны. Але самым маштабным і значным форумам для ўсёй сістэмы адукацыі стане Рэспубліканскі педагагічны савет, які распачаў учора сваю работу ў Мінску.

Каля тысячы педагогаў, кіраўнікоў устаноў адукацыі, прадстаўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама грамадскіх аб'яднанняў і галіновага прафсаюза сабраліся ў Мінску, каб абмеркаваць стратэгічныя пытанні развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі да 2030 года.

У першы дзень было арганізавана 13 тэматычных секцый. Спецыялісты абмеркавалі сучасныя падыходы да павышэння якасці дашкольнай адукацыі, уклад прафесійнай адукацыі ў інавацыйнае развіццё беларускай эканомікі, асноўныя напрамкі развіцця вышэйшай школы і паслядыпломнай адукацыі. Акрамя таго, у цэнтры ўвагі спецыялістаў аказаліся актуальныя аспекты сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ў сучасных умовах, развіццё інклюзіўнай адукацыі, удасканаленне падрыхтоўкі педагагічных кадраў, стварэнне бяспечнага і дружалюбнага асяроддзя ў школе, лічбавая трансфармацыя адукацыі і развіццё сістэмы неперарыўнай падрыхтоўкі кадраў ва ўмовах лічбавізацыі грамадства.

Сёння Рэспубліканскі педсавет працягне сваю работу на пленарным пасяджэнні з удзелам кіраўніка дзяржавы. Яго ўдзельнікі змогуць азнаёміцца з выстаўкай эфектыўнага педагагічнага вопыту, творчых дасягненняў педагогаў, навінкамі вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры, з адукацыйнымі рэсурсамі і тэхналогіямі ў сферы адукацыі.

Планаваныя змены ў галіне, якія выносяцца на форум, закладзены ў прынятым у першым чытанні праекце Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і праекце Канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года. Гэтыя дакументы былі распрацаваны з улікам рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу, даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада.

Шырокае абмеркаванне праектаў гэтых дакументаў прайшло ў розным фармаце з удзелам кіраўніцтва Міністэрства адукацыі на дзясятках дыялогавых пляцовак у рэгіёнах, на парламенцкіх слуханнях у Палаце прадстаўнікоў, на пасяджэннях экспертна-кансультатыўнага савета ў Савеце Рэспублікі, грамадска-кансультатыўнага савета пры Міністэрстве адукацыі, яны разгледжаны Рэспубліканскім саветам рэктараў, грамадскімі маладзёжнымі аб'яднаннямі.

Нагадаем, што асноўныя напрамкі развіцця сферы адукацыі былі вызначаны 24 жніўня 2017 года на пленарным пасяджэнні першага Рэспубліканскага педагагічнага савета з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У сваім выступленні кіраўнік дзяржавы акрэсліў галоўныя прынцыпы развіцця айчыннай адукацыі, акцэнтаваўшы ўвагу на дзяржаўнай падтрымцы, сацыяльнай справядлівасці і роўным доступе да адукацыі. Тады ўдзельнікі форуму абмеркавалі і прынялі Канцэптуальныя падыходы да развіцця сістэмы адукацыі на кароткатэрміновы (да 2020 года) і доўгатэрміновы (да 2030-га) перыяды.

На цяперашнім Рэспубліканскім педсавеце вызначаць асноўныя напрамкі работы сферы адукацыі, прыняўшы за аснову Канцэпцыю развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года. Сёння важна працаваць над павышэннем якасці нацыянальнай адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях і ступенях. Для гэтага прымаюцца комплексныя меры, якія ўключаюць развіццё змешаных формаў навучання, што спалучаюць традыцыйнае навучанне з дыстанцыйнымі формамі, прымяненне разнастайных методык навучання, варыятыўнасць навучальных планаў у адпаведнасці з запытамі навучэнцаў, самастойнасць установаў адукацыі ў фарміраванні навучальных праграм і выбары навучальных дапаможнікаў на конкурснай аснове, фарміраванне неабходных кампетэнцый у педагогаў, стварэнне сучаснага лічбавага адукацыйнага асяроддзя, распрацоўку і ўкараненне эфектыўных механізмаў фінансавання сістэмы адукацыі, выпрацоўку ўзгодненых падыходаў да ацэнкі якасці адукацыі праз сістэму міжнародных праграм і развіццё незалежных формаў ацэнкі і іншае. Усё гэта паслужыць выкананню найважнейшай задачы адукацыі — фарміраванню высокаманральнай асобы, якая валодае развітым пачуццём патрыятызму, адказнасці за свой лёс і лёс краіны.

Рэха прыёмнай кампаніі

ГУСТЫ АБІТУРЫЕНТАЎ

Якія прафесіі і спецыяльнасці выбіралі выпускнікі 2021 года?

20 жніўня прыёмная кампанія ў нашай краіне выйшла на фініш. У гэты дзень завяршыўся прыём дакументаў на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Але некаторыя прафтэхустановы, дзе не ўсе месцы пакуль запоўніліся, працягнуць набор да 15 верасня. Таму ў выпускнікоў школ, якія не паступілі на больш высокую ступень навучання, яшчэ ёсць шанц не губляць цэлы год, а атрымаць карысную ў жыцці рабочую прафесію. Інфармацыю аб вакансіях трэба шукаць на сайтах прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Пра гэта паведаміла журналістам начальнік управлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА.

Аўтасэрвіс і мехатроніка

Спецыяліст міністэрства канстатавала, што інтарэс з боку моладзі да прафесійна-тэхнічнай адукацыі расце, і ёсць спецыяльнасці, дзе нават складваецца конкурс атэстатаў.

— Цікава, што ў розных рэгіёнах у абітурыентаў карыстаюцца папулярнасцю розныя спецыяльнасці, што звязана з асаблівасцямі рынку працы ў рэгіёнах, — заўважыла Аляксандра Пятрова. — Напрыклад, у Віцебскай вобласці папулярнымі ў моладзі з'яўляюцца прафесіі «слесар па рамонце аўтамабіляў», «электразваршчык ручной зваркі», «аператар тэхналагічных установак». У Гомельскай вобласці (а гэта прамысловы рэгіён) — «станочнік шырокага профілю». У Гродзенскай — «аператар сувязі», «агент па абслугоўванні аўтамабільных перавозак». У Брэсцкай — «цырульнік» і «трактарыст-машыніст сельгасвытворчасці». У Мінску — «памочнік машыніста цеплавоза», «памочнік машыніста электравоза», «кухар», «кандытар». Лагічна, што ў сталіцы лідзіруюць прафесіі сферы паслуг.

18 жніўня завяршылася прыёмная кампанія ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Усяго на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі прынятыя больш за 36 тысяч чалавек: з іх за кошт сродкаў бюджэту — 24,5 тысячы абітурыентаў. На ўзроўні базавай школы — 13 210 абітурыентаў на бюджэтныя месцы, на ўзроўні 11 класаў — 11 338 чалавек.

Традыцыйна высокі конкурс складваецца на спецыяльнасцях ІТ-профілю, профілях «медыцына» і «мастацтва». «Радуе, што апошнім часам пачынаюць расці прахадныя балы на спецыяльнасцях па профілі «Тэхніка і тэхналогіі», такіх як «Аўтасэрвіс» і «Тэхнічная эксплуатацыя транспартных сродкаў», — падкрэсліла Аляксандра Пятрова. — Мы шмат гадоў працуем над абнаўленнем зместу адукацыйных праграм. Прыцягваем нашых сацыяльных партнёраў — вядучыя прадпрыемствы краіны, абсталёўваем рэсурсныя цэнтры, якіх у краіне зараз 51. Яны аснашчаны найноўшым абсталяваннем і арыентаваны на апераджальную падрыхтоўку кадраў, каб забяспечыць спецыялістамі, якія ўмеюць працаваць з інавацыйнымі тэхналогіямі, вытворчасці, якія зараз мадэрнізуюцца.

Трэці год вёўся набор на спецыяльнасць «Эксплуатацыя мехатронных сістэм прамысловага абсталявання». Дзякуючы шырокай прафарыентацыйнай рабоце абітурыенты ўжо ведаюць, што гэта за спецыяльнасць. І ў моладзі фарміруецца новы вобраз спецыяліста, які працуе на вытворчасці. З радасцю канстатуем, што ў абітурыентаў абуджаецца цікавасць і да машынабудаўнічага профілю. Прахадныя балы пры паступленні павышаюцца. Сумесная праца з прадпрыемствамі — заказчыкамі кадраў дае свой плён.

Псіхалогія і стаматалогія

У вышэйшыя навучальныя ўстановы на ўсе формы атрымання адукацыі залічана больш як 48 тысячы чалавек, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — каля 26,5 тысячы.

— У гэтым годзе практычна траціна ВНУ альбо аднавілі прыём па спецыяльнасцях, альбо адкрылі новыя, — паведаміла **кансультант управлення вышэйшай адукацыі галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэма ГЕРЛОЎСКАЯ.** — І яны былі запатрабаваныя ў абітурыентаў.

Высокія конкурсы склаліся па тых жа спецыяльнасцях, што і ў папярэднія гады. Так, на спецыяльнасці «Стаматалогія» ў БДМУ прахадны бал быў 387, «Фармацыя» — 365. На спецыяльнасці «Дызайн» у Гродзенскім дзяржаўным ўніверсітэце імя Янкі Купалы конкурс складаў больш як 8 чалавек на месца, у БДУ па гэтай жа спецыяльнасці — больш як 9 чалавек. Абітурыентаў па-ранейшаму цікавілі эканамічныя і юрыдычныя спецыяльнасці. У лідарах традыцыйна і спецыяльнасці ІТ-сферы.

Нядрэнная сітуацыя склалася і на педагагічных спецыяльнасцях, куды ў апошнія гады актыўна паступаюць выпускнікі профільных педагагічных класаў. Напрыклад, сярэдні конкурс у БДПУ на бюджэтныя месцы — 2,1 чалавека на дзённым аддзяленні і 2,2 — на завочным.

Найбольш высокі конкурс назіраўся ў галоўным педагагічным універсітэце краіны на наступных спецыяльнасцях дзённай формы атрымання адукацыі: «Псіхалогія» — 5,6 чалавека на месца, «Аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура (аздараўленчая)» — 4,0.

На трох спецыяльнасцях дзённай формы атрымання адукацыі («Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», «Руская мова і літаратура», «Руская мова і літаратура. Замежная мова») усе бюджэтныя месцы запоўніліся выпускнікамі профільных класаў педагагічнай накіраванасці, медалістамі і ўладальнікамі дыпломаў з адзнакай, якія паступаюць без здачы ЦТ.

На пяці спецыяльнасцях прахадныя балы былі 300 і вышэй — «Псіхалогія» (336), «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» (329), «Практычная псіхалогія» (324), «Лагапедыя» (315), «Выяўленчае мастацтва, чарчэнне і народныя мастацкія промыслы» (304).

Рост прахадных балаў быў адзначаны ў БДПУ на 13 спецыяльнасцях дзённай і 6 спецыяльнасцях завочнай форм атрымання адукацыі.

Істотна палепшыўся і якасны склад абітурыентаў. У 2021 годзе ў БДПУ падалі дакументы 209 выпускнікоў педкласаў (у 2020 годзе — 197), 83 медалісты (у 2020 годзе — 51) і 133 ўладальнікі дыплома з адзнакай (у 2020 годзе — 120).

Таксама на працягу трох апошніх гадоў адзначаецца рост колькасці юнакоў, якія паступілі ў БДПУ. Сёлета на факультэце фізічнага выхавання 60 % першакурснікаў складаюць юнакі, на гістарычным факультэце — 56 %, а на фізіка-матэматычным — 33 %.

— Абітурыенты з педагагічных класаў досыць матываваныя, — падзялілася сваім меркаваннем **загадчыца кафедры сучасных тэхналогій даўніверсітэцкай адукацыі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Ірына КАРЛЮКОВА.** — Наш універсітэт вылучаецца сваёй шматпрофільнасцю. Гэта класічная вялікая ВНУ з 15 факультэтамі. Адпаведна, мы набіраем абітурыентаў на 54 спецыяльнасці. Бюджэтны набор мы выканалі своечасова. Варта адзначыць, што шэсць факультэтаў у нас рыхтуюць па педагагічных спецыяльнасцях. Нас моцна парадавала, што там набор выкананы цалкам. Прычым члены прыёмнай камісіі адзначаюць, што абітурыенты з педагагічных класаў, якія паступаюць да нас, матываваныя. Партфоліа, якія яны падавалі ў прыёмную камісію, вартыя таго, каб абагульняць гэты вопыт. І мы спадзяёмся, што ў будучыні яны змогуць захапіць сваімі прадметамі школьнікаў.

Традыцыйны ажыятаж

Разам з тым у вышэйшых навучальных установах краіны ў гэтым годзе запоўніліся не ўсе бюджэтныя месцы, таму быў абвешчаны дадатковы набор на шэраг сельскагаспадарчых, тэхнічных і тэхналагічных спецыяльнасцяў. Але і пасля гэтага 490 месцаў усё роўна так і засталіся незапатрабаваныя. Хоць на некаторых спецыяльнасцях балы ў абітурыентаў падчас дадатковага набору аказаліся нават вышэйшыя, чым падчас асноўнага набору. А на спецыяльнасць «Фізіка. інфарматыка» ў БДПУ ў рамках дадатковага набору паступіў адзін медаліст.

Што датычыцца выпускнікоў прафільных аграрных класаў, а ў гэтым годзе адбыўся ўжо другі выпуск, то сельскагаспадарчыя спецыяльнасці выбраў з іх кожны трэці.

Як паведаміла Рэма Герлоўская, у гэтым годзе так званая «сляпая зона», калі заканчваецца інфармаванне абітурыентаў пра колькасць пададзеных заяў, звузілася з трох да адной гадзіны. Апошняе абнаўленне інфармацыі адбылося ў 17.00 — за гадзіну да закрыцця прыёмных камісій. Гэта крыху зменшыла ажыятаж, але на востразапатрабаваных у абітурыентаў спецыяльнасцях усё роўна напружанне захоўваецца літаральна да апошняй хвіліны — да закрыцця прыёмных камісій. Усе спрабуюць падлічыць свае шанцы паступіць на бюджэт. Дарэчы, у БНТУ ў сярэднім за кожны дзень прыёмнай кампаніі падавалася 500 заяў, выключэннем стаў апошні дзень, калі было пададзена адразу 1000 заяў. Але тут такі ажыятаж стаў ужо традыцыйным, бо аднолькавы набор сертыфікатаў можна падаць на мноства тэхнічных спецыяльнасцяў.

«Калі лакмусавай паперкай лічыць звароты, што паступілі на гарачую лінію Міністэрства адукацыі, то ў гэтым годзе скаргаў на недахоп інфармавання да нас не паступала, — канстатавала Рэма Герлоўская.

Матэрыялы старонкі «Адукацыя» падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Аляксандр ВЯРСОЦКІ:

«ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА ЛЮДЗЕЙ — ПРАДМЕТ МАЙГО НАЙПЕРШАГА КЛОПАТУ ЯК СТАРШЫНІ»

Пры наведванні Свіслачы 23 ліпеня Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка вызначыў раён як перспектыўны, якому патрабуецца добрая стратэгія, скіраванасць на апераджэнне ў развіцці. Аб новых пунктах росту і далейшай стратэгіі раёна — у гутарцы карэспандэнта «Звязды» са старшынёй Свіслацкага райвыканкама Аляксандрам ВЯРСОЦКІМ.

Напачатку — невялікая даведка. Новы старшыня працуе крыху больш за год, яму 44 гады, мае вышэйшую педагагічную адукацыю, скончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працаваў на некалькіх кіруючых пасадах. Перад прызначэннем старшынёй Свіслацкага райвыканкама быў начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама.

— Аляксандр Людвігавіч, чаго, на ваш погляд, трэба дабіцца на вашай тэрыторыі найперш?

— У першую чаргу павысіць заработную плату. Раён знаходзіцца ў апошніх радках па ўзроўні заработнай платы. І гэта прадмет майго найпершага клопату як старшыні. Такая сітуацыя склалася па розных прычынах. Адна з асноўных у тым, што раён аграрны, прамысловасці амаль што няма. На сёння, калі разглядаць эканоміку ў выглядзе каравая, то 80 % — гэта прадукцыя сельскай гаспадаркі, 11 % — прамысловасць, каля 7 % — будаўнічы комплекс.

— Не ведаю, як па іншых паказчыках, але ўраджайнасць зерневых, мяркуючы па зводцы, невысокая...

— Сапраўды, у сярэднім па раёне ўраджайнасць 26,6 ц/га, у нізкай ураджайнасці ёсць і нашы тэхналагічныя пралікі. Недахоп сродкаў для закупкі неабходных угнаенняў, недахоп машынна-трактарнага парка. Але ёсць гаспадаркі, дзе ўраджайнасць дасягае і 60 ц/га. Ёсць і такія, дзе 22. Мы галоўны ўхіл робім на жывёлагадоўлю, на кармавыя культуры, тыя ж саргагібрыдныя, для якіх гарачае надвор'е, наадварот, спрыяльнае. Вырошчваем сланечнік. Павялічваем плошчу пад азімыя культуры для кармоў. І ёсць добрыя зрухі. Яшчэ год таму па надоях малака мы былі на 12-м месцы, а па сённяшніх зводках — на 5-м. Безумоўна, высокая ўраджайнасць не пашкодзіць: больш кармоў можна нарыхтаваць. Наша асноўная задача на найбліжэйшы час — пасеяць не менш за 70 % азімых культур.

— На сёння ў раёне 345 вакансій. І, як відаць, гэта аграрны сектар. Як вядзецца работа па прыцягванні кадраў, тых жа выпускнікоў каледжаў і ВНУ?

— Лічу, што цяпер важна весці работу па арганізацыі мэтавых дагавораў. Гэта перспектыўны кірунак па замацаванні кадраў. Пакуль ім карыстаюцца далёка не ўсе кіраўнікі сельгасарганізацый. Трэба гэтую работу актывізаваць, такая ўстаноўка дадзена нядаўна падчас нарады з кіраўнікамі АПК раёна. Таксама ім і самім варта клапаціцца пра свае кадры, не ленавацца паехаць у наш Гродзенскі аграрны ўніверсітэт і заняцца іх падборам.

Немалаважную ролю адыгрывае і зарплата. Сёння маладому спецыялісту прапануюць зарплату 500 рублёў. Я ў іх пытаюся: вы свайго сына альбо дачку адправілі б на такую зарплату? Наўрад. Акрамя зарплаты, важна стварыць належныя ўмовы. Некаторыя забяспечаны бытавымі ўмовамі, гэта датычыцца медыцынскай сферы. Але ёсць сігналы, што ўмовы проста ніякія — чатыры голыя сцяны. Які малады спецыяліст там застанецца? Дарэчы, для поўнай справядлівасці трэба сказаць, што мы за апошнія два гады па колькасці мэтавых дагавораў адны з найлепшых у вобласці. Але з імі трэба працаваць, ствараць умовы, даць годную заработную плату.

— На ўмовы працы, дарэчы, звярнуў увагу Прэзідэнт, калі наведваў Свіслацкі раён...

— Прэзідэнт пабываў у хлебабулачным цэху і паставіў задачу палепшыць умовы працы. Таму будзем удасканальваць сістэму кандыцыянавання. Некаторыя ручныя працэсы будуць механізаваны. Што датычыцца прадпрыемства «Сельгастэхніка», дзе таксама пабываў Прэзідэнт, многія будынкі, якія пустуюць, будуць знесены, у іншых — наведзены парадак. Вядома, візіт кіраўніка дзяржавы не мог прайсці бясследна. Гэта магутны імпульс.

— Асаблівая ўвага падчас візіту ўдзялялася развіццю буйных інвестпраектаў у раёне, у прыватнасці будаўніцтву завода па дрэваапрацоўцы. Што гэта за праект?

— У раёне пачалася рэалізацыя даволі значнага праекта ААТ «ЭйчЭсБелакон» па будаўніцтве дрэваапрацоўчага завода на 250 рабочых месцаў. Узровень аплаты працы ў работнікаў будзе не 941 рубель, як цяпер у сярэднім у раёне, а значна вышэй. І тут важна выраўняцца па новым паказчыку, каб не пачаўся адток кадраў з аграрнага сектара. На гэта, дарэчы, звярнуў увагу і Прэзідэнт. Таму мая задача яшчэ і ў тым, каб у сельскай гаспадарцы заработная плата паступова расла.

«Ёсць добрыя зрухі. Яшчэ год таму па надоях малака мы былі на 12-м месцы, а па сённяшніх зводках — на 5-м».

— На якім этапе гэты праект?

— У маі наступнага года павінен адбыцца пробны пуск прадпрыемства. На праектную магутнасць завод выйдзе дзесьці ў кастрычніку 2022 года. Тут на першым этапе будзе створана вытворчасць пялетаў, піламатэрыялаў. У далейшых планах — драўнінныя пліты для каркаснага домабудавання. Літаральна днямі я сустракаўся з кіраўніцтвам будучага прадпрыемства — яны бачаць зацікаўленасць з боку Прэзідэнта і ўрада развіваць у невялікіх раёнах такія прадпрыемствы і плануюць пасля першай чаргі прыступіць да будаўніцтва другой. З увядзеннем гэтага завода прамысловая прадукцыя ў агульным аб'ёме ў нас узрасце да 80 %. Гэта вельмі вялікія аб'ёмы. Зменіцца і падатковая структура.

— Дрэваапрацоўка ў будучыні стане асноўным кірункам дзейнасці?

— У нас ёсць яшчэ адна прапанова ад літоўскай кампаніі, і мы яе таксама разглядаем. У раёне працуе СЭЗ з выгаднымі ўмовамі. Але ёсць важны стрымлівальны фактар. Не хапае электрычных магутнасцяў, яны ўсе задзейнічаны. Таму на гэты год урадам у інвестпраграму ўключана будаўніцтва падстанцыі на 63 МгВт, якую мяркуецца ўвесці ў 2023 годзе. Тады можна будзе гаварыць і аб новых прадпрыемствах. У прыватнасці, яшчэ адным пунктам росту можа стаць стварэнне лесапільнай вытворчасці кампаніяй «Сільва Лагістык». У СЭЗ яны зарэзервавалі 45 га плошчы пад будучую вытворчасць. Як толькі з'явяцца электрамагутнасці, яны ўключацца ў работу. Гэта два нашыя асноўныя праекты на найбліжэйшы час.

«Сёння маладому спецыялісту прапануюць зарплату 500 рублёў. Я ў іх пытаю: вы свайго сына альбо дачку адправілі б на такую зарплату?»

— Я ведаю, што раён прывабны для інвестараў у плане вузкакалейкі...

— Так, гэта даволі значны фактар. Для інвестараў гэта адзін з асноўных спрыяльных момантаў у размяшчэнні менавіта тут сваіх прамысловых магутнасцяў. Можна сказаць, што мы адзіны раён, які валодае такой перавагай — наяўнасць вузкакалейнай дарогі і звычайнай чыгункі.

— Інвестыцыі патрэбны не толькі ў вытворчасці, але і ў сацыяльнай сферы. Што ўлады плануюць зрабіць тут у найбліжэйшы час?

— У нас некалькі гадоў стаіць на кансервацыі былы школьны інтэрнат, і мы спадзяёмся, што сёлета будынак будзе ўнесены ў інвестпраграму. Там можна абсталяваць 23 кватэры для маладых спецыялістаў. Гэта даволі прывабны момант. Сёлета ў адной з былых школ у Свіслачы адкрываем фізкультурна-аздараўленчы комплекс з трэнажорным і фітнес-заламі, залы для заняткаў тэнісам і більярдам.

Дарэчы, у сферы адукацыі нам ёсць чым ганарыцца. У раёне два фіналісты рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года». Гэтым можа пахваліцца далёка не кожны раён краіны.

— Турыстычны патэнцыял, зразумела, стаіць на паўзе, як і паўсюдна, але, напэўна, ёсць і нейкія ідэі?

— У нас ёсць ідэя — і яна падтрымана губернатарам вобласці Уладзімірам Каранікам — па ўзнаўленні сядзібы «Багудзенкі» ў аграгарадку Поразава. Гэта былая панская сядзіба, помнік драўлянай архітэктуры і гісторыі канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. Раней тут была бальніца, але каля 20 гадоў аб'ект пустуе. Зразумела, што яго трэба ўзнавіць. Мы распрацавалі дарожную карту, дзе распісалі, хто за што адказны. Ёсць дагавор з лесагаспадарчым аб'яднаннем аб перадачы яго ім ва ўласнасць, і яны зробяць гэты аб'ект прыдатным для турыстычнага наведвання.

— Вы на пасту старшыні райвыканкама крыху больш за год. Наколькі амбіцыйным было рашэнне прыняць раён?

— Ісці на такую пасаду без амбіцый не мае сэнсу — лепш зусім не ісці. Я палюбіў гэты раён яшчэ задоўга да таго, як прыехаў сюды. Мне былі прапанаваны чатыры раёны. Я выбраў Свіслацкі, хоць ніякім чынам з ім не звязаны. Але па былых пасадах сутыкаўся з кіруючым саставам раёна, і ўсе яны здаваліся людзьмі вельмі адказнымі, неабыякавымі. Так і аказалася. І вельмі важна, што я не памыліўся ў гэтых людзях. Я быў рады і тады і зараз гэтага не ўтойваю, што многімі кампетэнцыямі абавязаны месцічам. Гэта пасада мяне развівае, і пакуль так застанецца, я буду з вялікім задавальненнем тут працаваць.

— А ваша каманда? Яна новая ці не?

— Ёсць тыя, каго я проста ўзгадняў, ёсць тыя, каго я прызначыў. Напрыклад, раённы выканаўчы камітэт — гэта зона маёй кампетэнцыі і адказнасці. У адкрытых акцыянерных таварыствах кіраўніка выбіраюць самі работнікі. Хачу сказаць, што наш кіраўнічы састаў у сваёй большасці кваліфікаваны і скіраваны на атрыманне вынікаў. А тыя, хто перасядзеў на сваіх пасадах, не валодае патрэбнай кампетэнцыяй, паціху зыходзяць. Я не прыхільнік рэзкіх рухаў, змяніў літаральна адзінкі. Гэта работа не аднаго дня.

— Дзякуй вам за размову і поспехаў у развіцці гэтай прыгожай і перспектыўнай тэрыторыі!

Маргарыта УШКЕВІЧ.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91»

Лот № 1: помещение транспортного назначения с инв. № 500/D-708117116, 479,5 кв. м, адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 48Б-2.

Обременение: аренда (информация на сайте ino.by).
Начальная цена с НДС – 231 664,50 бел. руб.
Задаток – 23 166,45 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 06.09.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 02.09.2021 в 11.00.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества УП «МИНСКЗЕЛЕНСТРОЙ» (Продавец)

Лот № 180821001: 1. АТТРАКЦИОН «КЛОУН», инв. № 000100300, демонтирован. **2. Запасные части.**
Местонахождение: г. Минск, пр-т Независимости, 84.
Начальная цена продажи с НДС – 3 884,53 бел. руб.

ЛОТ № 180821002: 1. АТТРАКЦИОН «СКАМЕЙКА», инв. № 000100313, демонтирован, требует ремонта; **2. Запасные части.** Местонахождение: 1. г. Минск, ул. Е. Полоцкой, 4; 2. г. Минск, пр-т Независимости, 84.
Начальная цена продажи с НДС – 25 413,63 руб.

Электронные торги состоятся 10.09.2021 с 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).

Извещение о проведении электронных торгов, в том числе детальная информация о порядке участия в электронных торгах, условиях участия, сроке заключения договора купли-продажи, условиях оплаты, размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (http://gki.gov.by), Минского городского исполнительного комитета (https://minsk.gov.by), Организатора электронных торгов (http://торги.бел, http://ino.by).

☎ Организатор электронных торгов:
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • www.торги.бел e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Продавец: Открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР» 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-187150, площадью – 927,7 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-31. Наличие мест общего пользования.

Нач. цена: 66 639,86 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 6 663,98 бел. руб.

Условие аукциона по лоту № 1: покупатель обязуется обустроить в изолированное помещение отдельный вход.

Лот № 2. Капитальное строение с инв. № 200/C-106182, наименование – емкость для хранения воды, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, емкость для хранения воды. Капитальное строение с инв. № 200/C-106630, площадью 37,1 кв. м, наименование – емкость для хранения воды № 2, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, емкость для хранения воды № 2. Капитальные строения расположены на зем. участке с кадастровым № 240100000001002628 площадью 13,5154 га (общая долевая аренда).

Нач. цена: 16 699,66 бел. руб. без учета НДС. **Задаток**: 1669,96 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 24.09.2021 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 24.08.2021 с 08.30 по 24.09.2021 до 10.00. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000001002628. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 25.06.2021.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с КККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782, ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК МТВКВУ22, УНП 390477566. Условия повторного аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона и возместить расходы по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплатить за объект в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта. По договоренности с Продавцом возможно предоставление рассрочки оплаты предмета торгов на срок до шести месяцев. **Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.** Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 6114046 – Труханович Александр Владимирович.

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «Телеханский завод столярных изделий» (УНП 200099487), **объявляет о проведении 22.09.2021 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона**

Предмет торгов:

Лот 1. ОАО «Телеханский завод столярных изделий», предприятие как имущественный комплекс с регистрационным номером 0001436.

Начальная стоимость: 1 659 200 бел. руб.

Минимальная стоимость: 1 348 100 бел. руб.

Размер задатка: 5 % от начальной стоимости имущества в размере 82 960 бел. руб.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества в размере 82 960 бел. руб.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Телеханский завод столярных изделий».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 5 % от начальной стоимости лота **не позднее 21.09.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются **с 9.00 25.08.2021 г. по 17.00 21.09.2021 г. на bankrottorg.by.** К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде, по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ и за публикацию объявлений в СМИ 5873,84 бел. руб., стоимость размещения объявления в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» согласно счет-фактуре, стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, аукционный сбор – 1 % от конечной цены предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения электронных торгов в сумме 300 000 бел. руб. без НДС; в течение календарного года оплата равными частями оставшейся суммы предмета торгов.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Старобинский» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

ЛЕГКОВОГО АВТОМОБИЛЯ LADA-212140

(легковой джип) 2011 года выпуска, цвет – белый, регистрационный № 6680 IE-5, идентификационный № XTA212140B1999760, особые отметки: счет-справка А2096769 от 24.05.2011, страна-изготовитель – Российская Федерация.

Начальная цена с НДС 20 % **– 3 332,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**333,20** бел. руб.).

Имущество расположено по адресу: Минская область, Солигорский район, г. п. Старобин, ул. Советская, 24.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере: 10 (десять) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда»: 06.07.2021.

Аукцион состоится **21.09.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 324, 320.

Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: (80174) 29-60-06, (8033) 604-83-64.

УНП 600071171

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение с инвентарным номером 442/С-6237 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Универсам»), общей площадью 351,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Островец, ул. Физкультурная, 29А.

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 424655100001001445 5, площадью 0,0578 га (назначение – земельный участок для размещений объектов розничной торговли (обслуживания здания магазина)), расположенном по адресу: г. Островец, ул. Физкультурная, 29А.

Начальная цена продажи лота – 230 000 руб. (двести тридцать тысяч рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 23 000 руб. (двадцать три тысячи рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Островецкий филиал Гродненского областного потребительского общества, 231201, г. Островец, ул. Ленинская, 12. Тел. 8-01591-286-72

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 10 сентября 2021 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 08 сентября 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОГО ЗДАНИЯ

с инвентарным номером № 610/С-62494 общей площадью 218,3 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887400001000817 (право аренды по 16.09.2024) площадью 0,2783 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, 14, восточнее д. Бытча.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: водоохранная зона реки, водоема, пл. 0,2783 га; охранная зона электрических сетей, пл. 0,0010 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 12 485,58** бел. руб.

Начальная цена снижена на 40 %. (задаток 10 % от начальной цены – **1 248,56** бел. руб.)

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере: 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» 02.07.2021.

Аукцион состоится **21.09.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2021** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра (8044) 555-25-91.

УНН 600134365

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Малое Залужье, ул. Центральная (объект 10/2020), дер. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная, участок № 1 (объект 117/2016), дер. Лужки, ул. Подгорная (объект 6/2019) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	дер. Малое Залужье, ул. Центральная	624883006601000150	0,1500	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	10 000
2	дер. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная, участок № 1	624883008201000110	0,0996	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	12 000
3	дер. Лужки, ул. Подгорная	624883005601000186	0,1153	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	20 000

Аукцион состоится 28 сентября 2021 г. в 15.00 в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел.: 801776, 68030).

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу:https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

УНП 600046563

АКТУАЛЬНЫЯ СРОДКІ МАБІЛЬНАСЦІ

Прагрэс не стаіць на месцы. Калі раней, яшчэ гадоў дзесяць таму, акрамя аўтамабіляў і матацыклаў, людзі садзіліся хіба што на двухколавы транспартны сродак пад назвай веласіпед, то сёння асаблівую папулярнасць набываюць індывідуальныя электронныя прылады перамяшчэння — электрасамакаты, манаколы, гіраскутары, сегвэі. Спрашчаючы жыццё карыстальнікам гэтых сродкаў, яны адначасова ўскладняюць яго іншым удзельнікам дарожнага руху. Паколькі выкарыстанне іх у ПДР пакуль не ўрэгулявана, уладальнікі найноўшага транспарту носяцца і па веласіпедных дарожках, і па тратуарах, і па абочынах дарог, перашкаджаючы руху аўтамабіляў, пешаходаў і павялічваючы рызыкі ўзнікнення ДТЗ.

Гіраскутар, сегвэй, манакола, самакат — модныя і сучасныя сродкі перамяшчэння. Іх яшчэ называюць сродкамі індывідуальнай мабільнасці, або СІМ. Яны не абсталяваныя эфектыўнай сістэмай бяспекі, аднак цалкам здольныя развіваць хуткасць ад 20 да 80 км/г, у залежнасці ад магутнасці электрычнай сілавой усталёўкі. Менавіта гэта з'яўляецца небяспечным для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху.

З пункту гледжання правілаў дарожнага руху, чалавек, які перасоўваецца на сродках індывідуальнай мабільнасці, лічыцца пешаходам і падпарадкоўваецца правілам для пешаходаў. Перамяшчацца на СІМ можна па тратуарах, пешаходных і веласіпедных дарожках, у межах пешаходных зон, а таксама ў месцах, закрытых для руху транспарту: у парках, скверах, дварах і на спецыяльна адведзеных для катання пляцоўках.

Выязджаць на праезную частку на сродках індывідуальнай мабільнасці нельга! Каб перайсці дарогу, трэба спешыцца і перайсці дарогу па пешаходным пераходзе.

Важна адзначыць, што такі транспарт можа быць небяспечным, асабліва калі ім кіруе непаўнагадовы. СІМ могуць развіваць значную хуткасць, што стварае высокую верагоднасць страты кіравання. Пры гэтым многія карыстальнікі прылад, выязджаючы на праезную частку, не выкарыстоўваюць ахоўную экіпіроўку, чым падвяргаюць свае жыццё небяспецы.

Пры парушэнні правілаў дарожнага руху пешаходы і іншыя ўдзельнікі дарожнага руху прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці па арт.18. 20 КаАП Рэспублікі Беларусь:

— Парушэнне правілаў дарожнага руху пешаходам (асобай, якая кіравала СІМ), цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры ад адной да трох базавых велічынь.

— Парушэнне правілаў дарожнага руху пешаходам (асобай, якая кіравала СІМ) у стане алкагольнага ап'янення або стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў, цягне накладанне штрафу ў памеры ад трох да пяці базавых велічынь.

— Парушэнне правілаў дарожнага руху пешаходам (асобай, якая кіравала СІМ), што пацягнула стварэнне аварыйнай абстаноўкі, цягне накладанне штрафу ў памеры ад трох да васьмі базавых велічынь.

— Парушэнне правілаў дарожнага руху пешаходам (асобай, якая кіравала СІМ), што пацягнула прычыненне пацярпеламу лёгкага цялеснага пашкоджання, або пакіданне месца дарожна-транспартнага здарэння, цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад пяці да дваццаці базавых велічынь.

Адміністрацыйная адказнасць за вышэйназваныя правапарушэнні надыходзіць з 16 гадоў. У выпадку здзяйснення непаўналетнім правапарушэння да дасягнення ўзросту прыцягнення да адказнасці прыцягваюцца законныя прадстаўнікі (бацькі, апекуны, папячыцелі) па ч. 10.3 КаАП Рэспублікі Беларусь (невыкананне абавязкаў па выхаванні дзяцей), што цягне накладанне штрафу ў памеры да дзесяці базавых велічынь.

Пакуль перамяшчэнне на гіраскутарах, манаколах і электрасамакатах дзеючым заканадаўствам у поўнай меры не ўрэгулявана. Людзі, якія карыстаюцца гэтымі сродкамі мабільнасці, у асобную групу ўдзельнікаў дарожнага руху не вынесеныя і не надзелены якімнебудзь статусам. Аднак у МУС ужо падрыхтавалі зборправілаў.

За 2021 год на беларускіх дарогах па віне веласіпедыстаў адбылося 62 ДТЗ, у іх 8 чалавек загінулі і 53 атрымалі траўмы. У параўнанні з 2020-м пачасціліся выпадкі ДТЗ і са сродкамі індывідуальнай мабільнасці: аўтамабілісты не паспяваюць зрэагаваць.

Як распавяла **старшы інспектар па асаблівых даручэннях Галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Беларусі Ганна БАНАДЫК,** асоб, якія перасоўваюцца на гіраскутарах, манаколах, электрасамакатах, прапануюць разглядаць у якасці пешаходаў. У такім выпадку ездзіць на сродках персанальнай мабільнасці яны змогуць па веласіпеднай дарожцы, а пры яе адсутнасці — па тратуары, пешаходнай дарожцы альбо абочыне.

Па словах прадстаўніка Дзяржаўтаінспекцыі, **да ўдзелу ў дарожным руху дапусцяць прылады,** якія адказваюць наступным патрабаванням:

- тэхнічна магчымая хуткасць — не больш за 25 км/г;
- спраўная тармазная сістэма і рулявое кіраванне;
- наяўнасць фары і ліхтара пры руху ў цёмны час сутак або ва ўмовах недастатковай бачнасці.

Калі сродак персанальнай мабільнасці не будзе адказваць названым патрабаванням, яго ўдзел у дарожным руху забароняць, адзначыла Ганна Банадык. Таксама плануюць забараніць ездзіць на гіраскутарах, манаколах і электрасамакатах дзецям да 12 гадоў.

Перасякаць праезную частку на такіх прыладах трэба будзе са звычайнай хуткасцю пешахода. Пры гэтым знізіць хуткасць спатрэбіцца да перасячэння праезнай часткі, а выязджаць на дарогу — толькі пры ўмове гарантавання бяспекі ўсіх удзельнікаў дарожнага руху.

Старшы інспектар па асобых даручэннях галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС падкрэсліла, што не варта чакаць унясення змяненняў у ПДР — думаць аб сваёй бяспецы трэба сёння і цяпер. Таму, перасоўваючыся на сродках персанальнай мабільнасці, **выконвайце простыя правілы:**

- перамяшчайцеся па тратуарах, веласіпедных дарожках, пешаходных зонах, абочынах, не ствараючы перашкоды іншым удзельнікам дарожнага руху;
- выбірайце хуткасць, якая дазволіць у выпадку ўзнікнення перашкоды на шляху спыніцца без экстранага тармажэння;
- моцна трымайцеся за руль (пры яго наяўнасці);
- не перавозьце пасажыраў;
- не адцягвайце ўвагу на тэлефонныя размовы і прагляд паведамленняў падчас руху;
- панізьце хуткасць і будзьце гатовыя да рэзкай змены руху, калі ўбачыце паблізу дзяцей;
- пазначце сябе святлоадбіўнымі элементамі ў цёмны час сутак і пры недастатковай бачнасці;
- усталюйце сперади транспартнага сродку фару, якая выпраменьвае белае святло;
- выкарыстоўвайце шлем і ахоўную экіпіроўку;
- не карыстайцеся сродкамі персанальнай мабільнасці ў стане ап'янення або пры дрэнным самаадчуванні.

Паважаныя бацькі, купляючы дзіцяці сродкі індывідуальнай мабільнасці, важна разумець, што гэта не цацка. Растлумачце дзецям асноўныя правілы бяспечных паводзін на вуліцы падчас катання. Памятайце, што няўхільнае іх захаванне — залог захавання жыцця і здароўя вашых дзяцей. Беражыце сябе і будзьце здаровыя.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

У рэгіёнах

Свята агурка — у 15-ы раз

Дзень агурка ў 15-ты раз адзначылі госці і жыхары Шклова. Агурочная весялосць упершыню разгарнулася на тэрыторыі гарадской гімназіі, якая гістарычна лічыцца гандлёвым цэнтрам горада. Юбілейную дату адзначалі ярка, смачна і музычна.

«Мы вельмі любім наша агурочнае свята, папулярнасць якога ўжо даўно выйшла за межы Шклоўскага раёна, — адзначыла **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любоў МАЦЮШОНАК.** — Шклоў спрадвеку лічыўся сталіцай агуркоў, і цяпер мы гэтыя традыцыі працягваем. Дзякуючы такім гулянням можна ў поўнай меры адчуць, як нашы дзядулі і бабулі адзначалі дзень збору летняга ўраджаю — шырока, весела і з душой. Вядома ж, мы паспрабавалі аднавіць гэтую атмасферу, каб людзі адпачылі, пагутарылі і добра правялі час».

На тэрыторыі гарадской гімназіі размясцілася некалькі тэматычных зон. Кожны жадаючы змог знайсці забаву па гусце. Напрыклад, шмат людзей тоўпілася ў гарадзе майстроў каля зоны рамеснікаў. Папулярнасцю ў дзяўчат карысталіся яркія і незвычайныя ўпрыгажэнні — агурочныя брошкі, агароднінныя каралі і завушніцы. Гаспадыні старэйшага ўзросту цікавіліся вырабамі з дрэва — апрацоўчымі дошкамі, лыжкамі, міскамі і іншым кухонным начыннем. У сваю чаргу мужчыны не выпускалі магчымасці пагуляць там, дзе сытна і смачна, — у зоне гастрафэсту. А дзеці бегалі на спартыўна-забаўляльных пляцоўках.

Як у Слоніме лася ратавалі

Такая гісторыя са шчаслівым канцом адбылася 22 жніўня паміж вёскамі Лапухова і Міжэвічы ў мястэчку, якое тутэйшыя жыхары называюць Імшар. Гэта багністая мясціна, дзе яшчэ гадоў пяцьдзясят таму жыхары наваколля здабывалі торф. У выніку чалавечай дзейнасці тут засталіся ямы глыбінёй да трох метраў з зыбкай глебай, зарослыя травой. Сюды і праваліўся лось.

«Слонімскі веснік».

Трэба сказаць, рагатаму вельмі пашанцавала: у гэты дзень сланімчанін Васіль Скурат вырашыў сабраць брусніц і адправіўся ў Імшар. Там ён і ўбачыў лася, які трапіў у бяду. Васіль хутка з'ездзіў у родную вёску, сабраў неабыякавых землякоў. Лапухоўскія ратавальнікі па закліку сэрца, узброіўшыся лапатай, сякерай, бензапілой, аўтамабільным тросам, прыбылі на тарфянік. Выратавальная «аперацыя» заняла больш за тры гадзіны.

Лось, выбраўшыся з багны, адбег на некалькі метраў, спыніўся, паглядзеў на «ратавальнікаў», як бы дзякуючы, і спакойна пайшоў па сваіх справах.

Фотазона да 150-годдзя Баранавіч

На прапанову Баранавіцкага гарвыканкама і Савета дэпутатаў упрыгожыць горад, прымеркаваўшы апошняе да яго паўтаравекавога юбілею, адгукнуліся многія прадпрыемствы, арганізацыі і прадпрымальнікі.

У гандлёвым доме «Вясёлка», напрыклад, размешчана тэматычная фотазона, якая нагадвае наведвальнікам аб 150-м дні нараджэння Баранавіч. Сфатаграфавацца на памяць можна на пляцоўцы паміж першым і другім паверхамі.

«Пірэвіцкія званы»: гучаць і саграваюць сэрца

У суботу, 21 жніўня, аграгарадок Пірэвічы Жлобінскага раёна сустракаў гасцей — удзельнікаў штогадовага раённага свята «Пірэвіцкія званы», прымеркаванага да Года народнага адзінства.

Ужо за гадзіну да пачатку правядзення мерапрыемства каля мясцовага сельскага Дома культуры гучалі народныя песні, працавалі падворкі філіялаў сельскіх дамоў культуры, атракцыёны, выязны гандаль, выстаўкі-продажы, майстры аквагрыму.

«Новы дзень».

Праграма свята была насычаная і разнастайная. Гучалі цёплыя словы ў адрас мясцовых жыхароў, віншаванні і кампліменты іх талентам і працавітасці. Падарункамі ад Пірэвіцкага сельсавета былі адзначаны пары, якія пражылі ў шлюбе 55, 60 і 65 гадоў. Шэраг мясцовых жыхароў быў узнагароджаны ганаровымі граматамі і падарункамі за шматгадовую добрасумленную працу. На сцэнічнай пляцоўцы з вялікім поспехам выступілі артысты і калектывы з розных куткоў Жлобінскага раёна. Удосталь насмяяліся гледачы дзякуючы ўдзельнікам гумарыстычнага шоу «Рагатуха», па заслугах ацанілі неардынарнае дэфіле «Асцярожна, ураджай!», а таксама выступленне клуба Kendo. Мясцовая моладзь здзівіла творчым нумарам «Рознакаляровыя шары», выдатным вакалам і харэаграфіяй.

Завяршылася раённае свята маладзёжнай дыскатэкай з гульнямі і конкурсамі.

КАРАНІ І КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 5 (59)

Небяспечныя адходы

ПЕСТЫЦЫДЫ І ПХБ-АБСТАЛЯВАННЕ

З годна з умовамі Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках (САЗ), да якой наша краіна далучылася ў 2004-м, да 2025 года трэба спыніць выкарыстанне абсталявання, у якім утрымліваюцца поліхларыраваныя біфенілы (ПХБ). У Беларусі прыкладна 500 уласнікаў маюць абсталяванне, у якім утрымліваюцца ПХБ, — 37 тысяч кандэнсатараў і каля 370 трансфарматараў. У краіне таксама захоўваецца больш за 10 тысяч тон непрыдатных пестыцыдаў. Для знішчэння такіх небяспечных адходаў у Гомельскай вобласці Беларусі будуецца спецыялізаваны аб'ект.

ШКОДНЫЯ НАЧЫНКІ

Каб выконваць палажэнні Канвенцыі, а таксама дзеля вырашэння праблем са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі, у Беларусі распрацаваны і рэалізаваны тры нацыянальныя планы. Падрыхтаваны і здзяйсняецца чацвёрты ў межах падпраграмы 3 «Абыходжанне са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі» Дзяржаўнай праграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў на 2021—2025 гг.», расказала **Вольга САЗОНАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Сярод рэалізаваных мерапрыемстваў — стварэнне заканадаўчай базы, якая рэгулюе парадак абыходжання з САЗ, праведзена іх інвентарызацыя, зроблена пераўпакоўка і забяспечана экалагічна бяспечнае захоўванне непрыдатных пестыцыдаў, а таксама абсталявання і адходаў, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы (ПХБ), створана і аптымізуецца адзіная база пра САЗ і іншае.

Першапачатковы спіс хімічных рэчываў, абазначаных як стойкія арганічныя забруджвальнікі, утрымліваў 12 найменняў. Аднак па меры назапашвання інфармацыі пра хімічны склад, уласцівасці САЗ, іх паводзіны ў наваколлі і ўздзеянне на жывыя арганізмы, пералік пашырыўся да 28 пазіцый. Дадаткова ўнесеныя рэчывы істотна адрозніваюцца сферамі прымянення і прызначэння. Асаблівасць прамысловых хімікатаў на аснове САЗ — іх выкарыстанне ў якасці прымесяў і дабавак у гатовых вырабах.

— Як правіла, утрыманне новых САЗ у канчатковай прадукцыі вар'іруецца ад 0,01 % да некалькіх працэнтаў, — удакладніла Вольга Сазонава. — Гэта азначае, што працэс выяўлення і ідэнтыфікацыі такіх вырабаў і рэгуляванне абыходжання з адходамі, якімі яны становяцца пасля завяршэння тэрміну службы, значна больш складаны ў параўнанні з хімічнымі рэчывамі, што выкарыстоўваюцца практычна ў чыстым выглядзе. Таму Мінпрыроды сумесна з Акадэміяй навук пастаянна працуе над распрацоўкай метадалогіі па выяўленні такіх рэчываў, правілаў і рэкамендацый па экалагічна бяспечным абыходжанні з імі.

А з 10 тысяч тон непрыдатных пестыцыдаў каля 13 % захоўваецца на тэрыторыі сялъгаспрадпрыемстваў і райаграсэрвісаў. 45 % — на комплексе па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскй вобласці. Каля 40 % — у падземных захаваннях, тры з якіх у Віцебскай вобласці, па адным у Гомельскай і Магілёўскай. Ужо ліквідаваны Гершонскае захаванне на Брэстчыне і Слонімскае на Гродзеншчыне. Больш за 2 000 тон непрыдатных пестыцыдаў з апошняга, якое было найбуйнейшым у краіне, вывезена на абясшкоджванне за межы краіны. У працэсе ліквідацыі — Петрыкаўскае (Гомельшчына) і Гарадоцкае (Віцебшчына) захаванні.

Па выніках мінулага нацыянальнага плана, з ужытку вывелі 62,6 % абсталявання з ПХБ, а на наступнае пяцігоддзе запланавана пазбавіцца ад усяго абсталявання са шкоднай начынкай. Працягнецца таксама далейшае ўдасканаленне заканадаўства і сістэмы выяўлення і ўліку САЗ, у тым ліку мерапрыемствы па актуалізацыі адзінай базы па САЗ, іх маніторынгу ў аб'ектах навакольнага асяроддзя, уплыву на насельніцтва, стварэнне аб'ектаў па абясшкоджванні і ліквідацыі небяспечных адходаў.

У прыватнасці, гэта закупка абсталявання і стварэнне аб'екта экалагічна бяспечнага знішчэння САЗ і іншых небяспечных адходаў на базе комплексу па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў у Гомельскай вобласці; абясшкоджванне ўсіх непрыдатных пестыцыдаў, якія захоўваюцца на складах, і прыкладна 60 % усяго абсталявання з ПХБ, праінфарміравала Вольга Сазонава.

БЯСПЕЧНАЕ ЗНІШЧЭННЕ НЕБЯСПЕЧНАГА

Дзякуючы далучэнню да канвенцыі ў Беларусі рэалізоўваецца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі Рэспублікі Беларусь, ГЭФ-6» на суму 8,4 млн долараў, расказаў яго **кіраўнік Дзяніс КАВАЛЕНКА:**

— Праект утрымлівае тры кампаненты: устойлівае кіраванне ПХБ, ліквідацыя запасаў непрыдатных пестыцыдаў, умацаванне і планаванне патэнцыялу для ўстойлівага кіравання хімічнымі рэчывамі.

У межах першага кампанента плануецца пасадзейнічаць прадпрыемствам краіны ў бяспечным абясшкодженні абсталявання, якое ўтрымлівае ПХБ, у тым ліку праз сафінансаванне да 75 % кошту дадзенай працэдуры. Мінпрыроды праводзіць конкурс па адборы кампаній, якія такім чынам пасадзейнічаюць абясшкодженню каля 430 тон такога абсталявання найбуйнейшых яго ўласнікаў. Наступным этапам мяркуюць падтрымаць арганізацыі, у якіх колькасць ПХБ-абсталявання складае ад некалькіх соцень кілаграмаў да некалькіх тон. Гатоўнасць да ўдзелу ў праекце пацвердзіла больш як 300 арганізацый, якія агулам маюць каля 600 тон ПХБ-абсталявання.

Паміж Мінпрыроды і арганізацыяй Geocoma для рэалізацыі другога кампанента заключана пагадненне на экалагічна бяспечнае знішчэнне 700 тон непрыдатных пестыцыдаў, якія захоўваюцца на складах сельгасарганізацый Гродзенскай і Віцебскай абласцей. Кампанія ўжо рыхтуе гэтыя адходы да вывазу ў Германію на знішчэнне, паведаміў Дзяніс Каваленка:

— Праектам запланавана таксама абследаванне падземных захаванняў. Цяпер франтальна даследуецца найбуйнейшае з іх — Петрыкаўскае. Робяцца разлік плошчы і аэрафотаздымка з нанясеннем контураў захавання, адбіраюцца і аналізуюцца на хімічнае забруджванне глебы, вывучаюцца даныя маніторынгу стану падземных водаў, разлічваецца хуткасць распаўсюджвання пестыцыдаў у іх, а таксама фарміраванне арэолу забруджвання навакольнага асяроддзя ў раёне. Па выніках будзе створаны план ліквідацыі захавання з ацэнкай тэрмінаў яго выканання і кошту. Такія ж планы будуць падрыхтаваныя і для ліквідацыі астатніх захаванняў.

Распрацоўка нарматыўных актаў прадугледжана трэцім кампа-

Здаровае харчаванне

УСІМ У ДАПАМОГУ НІТРАТАМЕР

Існуе меркаванне, што ўсё, што вырасла «на сваім агародзе», не ўтрымлівае нітратаў, бо ўласнік не выкарыстоўвае ўсялякія агрэсіўныя ўзмацняльнікі росту гародніны і садавіны. Але, аказваецца, нітраты — усюдыісныя, яны ёсць і ў вадзе, і ў ежы. Пытанне ў тым, колькі іх там. І гэта можна праверыць.

Фота fiyatgrafik.com.

Сёлета РУП БелНДЦ «Экалогія» прапанавала новую паслугу — «Экспрэс-тэст на ўтрыманне нітратаў у прадуктах харчавання, вымярэнне жорсткасці вады», якая ўжо карыстаецца добрым попытам у прыватных асоб.

Нітраты, або як іх яшчэ называюць, солі азотнай кіслаты, утрымліваюцца ў любых прадуктах, вадзе і нават арганізме чалавека. Для здароўя чалавека небяспечная менавіта іх павышаная канцэнтрацыя, якая нярэдка сустракаецца ў прадуктах харчавання. Млоснасць, аддышка, слабасць — самыя распаўсюджаныя сімптомы атручэння нітратамі. Гэта небяспечны стан, які ў далейшым можа прывесці да змен у нервовай і сасудзістай сістэмах. Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўстанавіла нормы ўтрымання нітратаў у прадуктах, але выконваюцца яны не заўсёды. Вось чаму важна ведаць, колькі нітратаў змяшчаецца ў тых ці іншых прадуктах.

Акрамя тэсціравання на нітраты, спецыялісты БелНДЦ «Экалогія» могуць ажыццявіць праверку жорсткасці вады і радыяцыйнага фону прадметаў.

Для атрымання неабходнай паслугі трэба запоўніць заяўку на сайце www.ecoinfo.by. Спецыялісты могуць выехаць на месца альбо правесці ўсе замеры ў офісе навукова-даследчага цэнтра.

БелНДЦ «Экалогія» прымяняе прыбор Greentest 3 — нітратамер і вымяральнік жорсткасці вады, які атрымаў прызнанне і ўзнагароды на замежных выстаўках, мае дэкларацыю аб адпаведнасці.

Аднак важна падкрэсліць: справаздача аб тым, што ў прадстаўленым узоры, напрыклад, бульбы, узровень утрымання нітратаў не перавышаны, падыходзіць толькі для патрэб хатняй гаспадаркі. То-бок, калі чалавек плануе прадаваць тую самую бульбу на базары, трэба будзе атрымаць адпаведны пакет дакументаў.

Але вернемся да пачатку нашай публікацыі. Як запэўніваюць спецыялісты, тое, што чалавек на сваім агародзе не выкарыстоўвае ніякіх хімічных угнаенняў, на жаль, не гарантуе адсутнасці перавышанага ўтрымання нітратаў у атрыманым ураджаі. Таму лепш падстрахавацца і праверыць. Тым больш цэны цалкам даступныя. Поўная праверка для фізічнай асобы, гэта значыць, па трох параметрах: нітраты, жорсткасць вады і радыяцыйны фон — 35 рублёў, з улікам кошту выезду спецыяліста — 45 рублёў, адзін параметр — 15 і 20 рублёў адпаведна. Для юрыдычных асоб паслугі на 5-10 рублёў дарожэйшыя. Скажам, калі садовае таварыства вырашыць праверыць жорсткасць вады, гэта абыдзецца ў 24 рублі без уліку выезду спецыяліста.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Чытайце ў жнівеньскім нумары часопіса «Родная прырода»:

- ✓ **Бурштын Беларусі: гісторыя і асаблівасці**
- ✓ **Каго выхоўвае кінолаг — сабаку ці гаспадара?**
- ✓ **З Астраўца — у беларускае кругасветнае падарожжа**
- ✓ **Экалагічны шопінг — чаму гэта важна?**
- ✓ **Юрый Скрыпко: «Шкло мае бясконцы тэрмін службы»**

Што робіцца ў Беларусі для засцярогі ад небяспечных забруджвальнікаў

нентам. Нацыянальны план выканання абавязкаў па рэалізацыі палажэнняў Стакгольмскай канвенцыі ўключаны ў Дзяржпраграму аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў на 2021—2025 гг.

— У найбліжэйшы час плануецца распрацоўка дакументаў па вызначэнні САЗ у паветры, асадку сцёкавых водаў, цвёрдых адходах, электратэхнічных

вырабах, — дадаў эксперт. — Дзякуючы праекту ў айчынныя лабараторыі закуплена абсталяванне, якое дазваляе вызначаць небяспечныя хімічныя рэчывы ў вадзе. На сайце https://soz.minpriroda.gov.by/ можна паглядзець актуальную інфармацыю аб праекце ці аператыўна атрымаць адказы аб уздзеянні САЗ на насельніцтва.

ЭКАЛАГІЧНЫЯ РЫЗЫКІ

Мэта яшчэ аднаго праекта «Узгодненае кіраванне ўтылізацыяй азонаразбуральных рэчываў і стойкіх забруджвальнікаў у Беларусі, ва Украіне, Казахстане і Арменіі» — экалагічна бяспечны збор і знішчэнне такіх адходаў, а таксама азонаразбуральных рэчываў (АРР), якія вызначаны Манрэальскай канвенцыяй. Мяркуецца таксама стварыць сумесную сетку па ліквідацыі АРР для чатырох краін. Праект рэалізуецца з 2018-га і разлічаны на 60 месяцаў. Агульны бюджэт складае 19 млн доларaў, з якіх на Беларусь прыходзіцца каля 5 млн. На тэрыторыі нашай краіны праект каардынуюць Мінпрыроды, Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці (Комплекс) і кампанія «БелВТІ». Гэты праект уключаны ў Нацыянальны план, што падкрэслівае яго значнасць для нашай краіны, заўважыў **Андрэй ПІНІГІН, кардынатар праекта:**

— Чакаемы вынік яго рэалізацыі — стварэнне нацыянальнага патэнцыялу для перапрацоўкі небяспечных адходаў абраны Комплекс у Гомельскай вобласці, дзе цяпер ідуць работы. Закуплена тэхналагічнае абсталяванне коштам 2,5 млн доларaў. Тут захоўваецца, дарэчы, каля 5000 тон пестыцыдаў. Пастаўка, мантаж, увод у эксплуатацыю і першы год работы будуць праходзіць пад наглядам спецыялізаванай кампаніі ААН ЮНІДА. Гэта дазволіць максімальна вытрымаць міжнародныя стандарты ў дачыненні да перапрацоўкі падобных адходаў, а аб'ект будзе першы на тэрыторыі постсавецкай прасторы. Стварэнне гэтага аб'екта таксама паспрыяе імпартазамяшчэнню, бо пакуль падобныя адходы для знішчэння вывозяцца за мяжу.

Знішчэнне небяспечных адходаў значна паменшыць экалагічныя рызыкі ўздзеяння іх на навакольле. Непрыдатныя пестыцыды, напрыклад, якія захоўваюцца з 1970—1980-х гадоў, маюць рызыку распаўсюджвання праз воднае асяроддзе. А частка з іх — самаўзгаральныя, дадаў спецыяліст:

— На будаўніцтве аб'екта мы прымяняем тэхналогію спальвання. Адпаведна, выкарыстоўваецца вялікая колькасць фільтрацыйных пылад. Тэхналагічная лінія — 8-метровая печ, побач з якой размешчаны яшчэ большага памеру фільтрацыйныя элементы, скруберы і спецыяльныя прыстасаванні для адсочвання і маніторынгу выкідаў.

Магутнасць аб'екта разлічана на знішчэнне 1600 тон небяспечных адходаў на год.

Ірына СІДАРОК.
Фота soz.minpriroda.gov.by.

Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

НОВЫ ЗАКАЗНІК НА ПАЛЕССІ: БЫЦЬ ЦІ НЕ?

Меркаваная тэрыторыя заказніка знаходзіцца ў межах Столінскага раёна Брэсцкай вобласці і займае паўночна-ўсходнюю частку леса-балотнага масіву ў басейне ракі Льва. З поўдня заказнік будзе прымыкаць да рэспубліканскага заказніка «Альманскія балоты».

Аб'яўленне поймы ракі Львы асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыяй (ААПТ) праводзіцца ў адпаведнасці з Рэгіянальнай схемай рацыянальнага размяшчэння асабліва ахоўных прыродных тэрыторый мясцовага значэння да 1 студзеня 2024 года, зацверджанай рашэннем Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў ад 20 снежня 2013 года, а таксама ў рамках выканання комплексу мерапрыемстваў па рэалізацыі Схемы нацыянальнай экалагічнай сеткі, зацверджанай урадам.

Пойма Львы з'яўляецца аб'ектам міжнароднай экалагічнай сеткі ахоўных прыродных тэрыторый «Ізумрудная сетка», а таксама адным з перспектыўных аб'ектаў фарміравання сеткі беларуска-ўкраінскіх прыродаахоўных тэрыторый. Пры праектаванні граніц ААПТ улічваліся і эканамічныя інтарэсы мясцовых землекарыстальнікаў.

Даследаваўшы пойму Львы, **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Дзмітрый ГРУМО** вызначыў, што ваколіцы ракі з'яўляюцца асяроддзем існавання для 22 відаў жывёл, уключаных у Чырвоную кнігу Беларусі. Усяго на тэрыторыі поймы Львы было выяўлена 49 відаў млекакормячых, 101 від птушак, 9 відаў земнаводных, 5 відаў паўзуноў і 17 відаў рыб. Падчас экспедыцый навуковец выявіў папуляцыі трох відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу: сальвінію плывучую (дробная папараць, якая плавае на паверхні вадаёмаў), балотныя фіялкі і белыя гарлачыкі. У пойме ракі таксама растуць 20 відаў дзікарослых раслін і грыбоў, якія маюць патрэбу ў прафілактычнай ахове.

Дзмітрый Грумо лічыць, што стварэнне заказніка «Пойма Львы» неабходнае для падтрымання біялагічнай разнастайнасці, захавання і аховы месцаў росту і існавання флоры і фаўны водна-балотных угоддзяў.

Стварэнне заказніка выклікала неадназначную рэакцыю ў мясцовых жыхароў, у сувязі з чым супрацоўнікі Інстытута эксперыментальнай батанікі, спецыялісты Столінскага райвыканкама, грамадскія арганізацыі праводзяць сходы грамадзян, на якіх абмяркоўваецца актуальнае пытанне.

Між тым, землі па заканадаўстве будуць замацаваныя за цяперашнімі землеўладальнікамі і землекарыстальнікамі, таму стварэнне ААПТ не акажа істотнага ўплыву на існуючую сістэму гаспадарання Столінскага раёна.

У межах асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі будуць дазволены ўсе віды традыцыйнай сельскагаспадарчай дзейнасці. Мясцовыя жыхары па-ранейшаму будуць мець магчымасць збіраць на тэрыторыі заказніка грыбы і ягады, займацца паляваннем (згодна з парадкам, што рэгулюецца заканадаўствам) і ўсімі відамі аматарскай лоўлі рыбы.

Акрамя таго, новая ААПТ будзе спрыяць развіццю экалагічнага турызму і стварэнню новых рабочых месцаў.

Кропка ў гэтай гісторыі не пастаўлена: абмеркаванні па стварэнні ААПТ «Пойма Львы» на тэрыторыі Столінскага раёна працягваюцца. І хочацца спадзявацца, што заказнік усё ж з'явіцца.

Анастасія АНІШЫНА,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ.

Скарбы нетраў

Чым багатая Беларусь: рэсурсы роднай зямлі

«Здабыча нафты і іншых карысных выкапняў» — такой тэме была прысвечана прэс-канферэнцыя, арганізаваная мультымедыйным цэнтрам Sputnik. Спецыялісты адказалі на пытанні пра навуковыя даследаванні, павелічэнне здабычы нафты ў 1,5 раза, неразведаныя рэсурсы Беларусі і экспартныя перспектывы.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

СПРЭЧКІ ВАКОЛ НАФТЫ

Нядаўна ў Беларусі было прынята рашэнне аб павелічэнні ўласнай здабычы нафты ў 1,5 раза. Ці магчыма гэта? **Алена БІБІКАВА, начальнік аддзела РУП «Навукова-вытворчы цэнтр геалогіі»,** паведаміла, што цяпер прадпрыемства вядзе маштабны праект, разлічаны на 2021—2025 гады, з мэтай пошуку новых перспектыўных радовішчаў. Яна лічыць, што «Прыпяцкі прагін» — тэрыторыя перспектыўная. Там радовішчы ўжо былі адкрыты і перададзены прадпрыемству «Беларуснафта» для распрацоўкі.

«Запасы нафты складаюць каля 44 мільёнаў тон. Павелічэнне запасаў можа адбыцца за кошт увядзення ў эксплуатацыю новых плошчаў; распрацоўкі новых і ўдасканалення старых тэхналогій на ўжо знойдзеных радовішчах», — распавёў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Мінпрыроды Алег МОХ.**

Між тым, **загадчык лабараторыі геатэктонікі і геафізікі Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі, кандыдат геолага-мінералагічных навук Яраслаў ГРЫБІК** лічыць, што павелічэнне ўласнай здабычы нафты ў 1,5 раза — задача невыканальная. «Тут ёсць некаторая блытаніна ў аб'ёмах здабычы і прыросце запасаў. У 1975 годзе было 8 млн тон здабычы нафты. У далейшым пайшло падзенне. 1,7 млн тон — гэта тое, што мы сёння здабываем». На думку прадстаўніка НАН Беларусі, у найбліжэйшы час павелічэнне здабычы нафты можа скласці 20—30 тысяч тон.

Апаненты Яраслава Грыбіка мяркуюць, што новыя сучасныя методыкі пошуку дазволяць больш дэталёва вывучыць нетры, выведаць радовішча і павялічыць здабычу. У прыватнасці, яны спасылаліся на вопыт В'етнама і Украіны — там выявілі вялікія залежы нафты ў месцах, дзе яе быць не павінна. Таму і беларускія спецыялісты звязваюць свае надзеі з выяўленнем прыкмет глыбінной нафты, нават акрэслены часавы адрэзак — канец 2025 года.

Намеснік дырэктара РУП «Беларускі дзяржаўны геалагічны цэнтр» Аляксей ВАЎРЫШ нагадаў, што ў Дзяржаўным кадастры нетраў улічана 98 аб'ектаў, уключаючы 88 радовішчаў, плюс яшчэ 10 нафтаперспектыўных структур, якія ў будучыні могуць даць прыток нафты і будуць пераведзены ў ранг радовішчаў.

ГАЗ ЁСЦЬ, АЛЕ МАЛА

За апошнія пяць гадоў НПЦ па геалогіі былі адкрытыя чатыры радовішчы прыроднага газу. «Напрыклад, на Мазырскім радовішчы выманыя запасы склалі 23,7 млн кубаметраў, на Паўднёва-Шацілаўскім радовішчы — 1,3 млн кубаметраў. Гэта значыць яны невялікія. Газ у нас ёсць, але не ў вялікай колькасці», — паведаміла Алена Бібікава.

ЭКСПАРТНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

«У нас стратэгічная сыравіна пасля нафты — гэта калійныя солі, іх запасы велізарныя, і асноўны аб'ём мы вывозім», — адзначыў Алег Мох.

На сённяшні дзень запасамі калійных соляў наша краіна забяспечана больш як на 50 гадоў. Гэтыя запасы рэнтабельныя, даюць добры прыбытак.

«Акрамя стратэгічных карысных выкапняў, у нас ёсць каля 20—25 відаў іншых: гэта будаўнічыя матэрыялы, кварцавыя пяскі, даламіты, сапрапелы, торф. Значная колькасць і падземных водаў: ёсць разнастайнасць падземных як прэсных водаў, так і мінеральных, і іх запасы значныя», — запэўніў прадстаўнік Мінпрыроды.

Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.

Извещение о проведении **24 сентября 2021 года** торгов на право заключения договоров на размещение средств рекламы на недвижимом имуществе и в подвижном составе, принадлежащем государственному предприятию «Минский метрополитен»

№ предмета торгов	Место размещения средства рекламы (согласно схеме)	Тип средства рекламы	Количество и размер средства рекламы	Материал изготовления средства рекламы	Срок действия договора	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. (с учетом НДС)
1	Станция метро «Октябрьская» ВБ-1	рекламный стенд без подсветки (растяжка над эскалаторным спуском)	5,0м × 1,5м – 1 ед.	баннерная ткань (**) (способ крепления – талреп М12, металлический трос 5 мм)	с 25 октября 2021 года по 24 октября 2026 года	891,26
2	Станция метро «Московская» ВБ-1	лайт-бокс (*)	0,89м × 1,25м – 3 ед.	алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло	с 8 ноября 2021 года по 7 ноября 2026 года	239,53
3	Станция метро «Могилёвская» ВБ-1	лайт-бокс (*)	2,25м × 1,2м – 1 ед.		с 8 ноября 2021 года по 7 ноября 2026 года	183,83
4	Станция метро «Автозаводская» ВБ-2	лайт-бокс (*)	2,25м × 1,2м – 2 ед.		с 8 ноября 2021 года по 7 ноября 2026 года	367,65
5	Станция метро «Пролетарская» ВБ-2	лайт-бокс (*)	2,25м × 1,2м – 4 ед. 0,8м × 1,2м – 1 ед. ИТОГО: 5 ед.		с 25 ноября 2021 года по 24 ноября 2026 года	445,63
6	Станция метро «Площадь Франтишка Богушевича»	лайт-бокс (*)	2,25м × 1,2м – 4 ед.		с 15 ноября 2021 года по 14 ноября 2026 года	354,00
7	Станция метро «Площадь Франтишка Богушевича»	лайт-бокс (*)	2,25м × 1,2м – 2 ед.		с 15 ноября 2021 года по 14 ноября 2026 года	177,00
8	Межстанционный пешеходный переход, соединяющий станции метро «Фрунзенская»–«Юбилейная Площадь»	лайт-бокс (*)	2,25м × 1,2м – 4 ед.		с 15 ноября 2021 года по 14 ноября 2026 года	354,00
9	Рекламный плакат, размещаемый в вагоне М-110 (проем между дверями и окном)	рекламный плакат формата 465 мм × 665 мм	**По второй линии – в 4 составах:** каждый 1 вагон – 5 ед.; (места № 1–2; 1–3; 2–1; 2–2; 2–3) каждый 2, 3, 4 вагон – 6 ед.; (места № 1–1; 1–2; 1–3; 2–1; 2–2, 2–3) каждый 5 вагон – 5 ед.; (места № 1–1; 1–2; 1–3; 2–2; 2–3). Итого: по 2-й линии: 112 ед. **По третьей линии – в 6 составах:** каждый 1 вагон – 5 ед.; (места № 1–2; 1–3; 2–1; 2–2; 2–3) каждый 2, 3 вагон – 6 ед.; (места № 1–1; 1–2; 1–3; 2–1; 2–2; 2–3) каждый 4 вагон – 5 ед.; (места № 1–1; 1–2; 1–3; 2–2; 2–3) Итого: по 3-й линии: 132 ед. **Всего: 244 ед.**	плакаты, выполненные на матовой самоклеющейся пленке ПВХ с клеевыми присосками, толщиной 100–120 мк., с легкосъемным, прозрачным и точечно нанесенным клеем (печать производить с использованием латексных и UV-чернил)	с 1 октября 2021 года по 30 сентября 2022 года	10 992,88
10	Рекламный плакат, размещаемый в вагоне М-110 (верхний пояс салона вагона)	рекламный плакат формата 600 мм × 240 мм	**По второй линии – в 4 составах:** каждый 1, 2, 3, 4, 5 вагон – 7 ед.; (места № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7). Итого: по 2-й линии: 140 ед. **По третьей линии – в 6 составах:** каждый 1, 2, 3, 4 вагон – 7 ед.; (места № 1; 2; 3; 4; 5; 6; 7). Итого: по 3-й линии: 168 ед. **Всего: 308 ед.**		с 1 октября 2021 года по 30 сентября 2022 года	1 563,65

Необходимые условия оплаты услуг по размещению рекламы:
- цена продажи предмета торгов учитывается в счет оплаты оказаний рекламных услуг по договору за 1-й месяц размещения;
- победитель торгов (лицо, приравненное к победителю торгов) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов обязан перечислить на счет государственного предприятия «Минский метрополитен» обеспечение исполнения договора. Обеспечение исполнения договора предоставляется на сумму, равную сумме цене продажи предмета торгов и учитывается в счет оплаты за оказание рекламных услуг по договору за 12-й месяц (исполнение договора) или 1 (один) последний месяц при досрочном расторжении договора либо при отказе от исполнения договора;
- условием оплаты услуг по размещению рекламы является предоплата за текущий месяц в размере 100 % в первые 3 рабочих дня текущего месяца;
- стоимость услуг по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и установленная договором, действует на первые 12 месяцев размещения, в дальнейшем, ежегодно стоимость услуг по размещению рекламы пересчитывается путем увеличения на индекс потребительских цен;
- по предметам торгов № 9,10 стоимость услуг по размещению рекламы в подвижном составе, определенная по итогам аукциона и установленная договором, подлежит перерасчету в связи с изменением графика движения поездов в Минском метрополитене в летний период, а также в случае обновления действующего подвижного состава (изменения количества) пропорционально количеству вагонов подвижного состава

(*) Необходимые условия по размещению рекламы:
1. разработать проект крепления рекламных конструкций и согласовать с государственным предприятием «Минский метрополитен»;
2. разработать проектную документацию по электроснабжению и согласовать с энергоснабжающей организацией, РУП «Минскэнерго» филиал «Энергосбыт» и ГУ «Государственный энергетический и газовый надзор»;
3. получить в государственном предприятии «Минский метрополитен»:
- технические условия на присоединение электроустановок к электрическим сетям Минского метрополитена;
- акт разграничения балансовой принадлежности электрических сетей (электроустановок) и эксплуатируемой ответственности сторон (стоимость – 1,5 базовые величины);
4. заключить договор на технологическое присоединение (подключение) электроустановок к электрическим сетям Минского метрополитена (стоимость подключения – 2,5 базовые величины);
5. предоставить проект подключения рекламных конструкций на станциях метрополитена к сети электроснабжения Минского метрополитена;
6. заключить договор на снабжение электрической энергией с государственным предприятием «Минский метрополитен»;
7. средства рекламы (лайт-боксы) передаются государственному предприятию «Минский метрополитен» в безвозмездное пользование на весь срок действия договора оказания услуг по размещению рекламы.
(**) При заключении договора победителю торгов (лицу, приравненному к победителю торгов) необходимо предоставить в государственное предприятие «Минский метрополитен» действующий документ, подтверждающий соответствие материала изготовления средств рекламы группе горючести Г1 по ГОСТ 30244-94.
По предмету торгов № 1–8 в течение срока действия договора об оказании услуг по размещению рекламы, по письменному обращению рекламодателя (не менее, чем за 60 дней до предполагаемой даты размещения) возможна замена рекламных конструкций на светодиодные видеоэкраны. При этом, необходимым условием является разработка и согласование с государственным предприятием «Минский метрополитен» проектов крепления и подключения новых рекламных конструкций к сети электроснабжения Минского метрополитена. Трансляция рекламного изображения должна осуществляться без аудиоконтента.

Форма проведения торгов – аукцион.

Организатор торгов – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

Государственное юридическое лицо – коммунальное транспортное унитарное предприятие «Минский метрополитен», г. Минск, пр-т Независимости, 6, тел. (017) 383-83-60.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **24 сентября 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с 24.08.2021 **по 20.09.2021** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Порядок оформления участия в торгах: к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов).

– копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, (назначение платежа – задаток для участия 24.09.2021 в торгах на право заключения договора на размещение средств рекламы по предмету торгов №_).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются: физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность; представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

Порядок определения победителя торгов: торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

Иные условия торгов:

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет государственного предприятия «Минский метрополитен» сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг государственного предприятия «Минский метрополитен» по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором на размещение средств рекламы);

- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор на размещение средств рекламы с государственным предприятием «Минский метрополитен» (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

Телефоны для справок: отдел аукционов – (017) 360-42-22, рекламно-информационный отдел Минского метрополитена – (017) 383-83-60.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); государственного предприятия «Минский метрополитен» – **www.metropoliten.by,** Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»
(организатор аукциона)
извещает об изменении начальной цены и суммы задатка по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества лот № 1 имущества
ОАО «ОРС Гомель» (арендодатель) –

Капитальное строение с инв. № 310/С-23734, площадью **211,9 кв. м, с составными частями и принадлежностями (106,5; 46,7; 5,2; 10,4; 1,5; 36,9; 4,7 кв. м)** назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин № 67. Местонахождение:** Гомельский р-н, Приборский с/с, на станции Прибор вблизи п. Пионер (магазин № 67), аукцион назначен на **21.09.2021 г**., опубликован в газете «Звязда» от 19.08.2021 г. № 158 (29527).
Начальная цена продажи права аренды: **626,70** бел. руб., сумма задатка – **626,70** бел. руб.
Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

УНП 400071204

ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ ОБЪЕКТА С ТОРГОВ

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
сообщает о снятии с аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков, назначенного на **30.08.2021, лота № 5** (земельный участок для строительства и обслуживания торгового павильона площадью 0,0891 га, кадастровый номер земельного участка 622282002101000106, расположенный по адресу: Дзержинский район, Добриневский с/с, п. Даниловичи).
Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.08.2021 г.

УНП 690324015

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «АП г. Барановичи»** (УНП 290237319) 225417, г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2, тел. +375 (163) 68-18-91.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **02 сентября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Автопоезд с полуприцепом (Автомобиль грузовой седельный тягач MAN TGX 18.460 2019 г. в., гос. номер АН 3657-1; полуприцеп платформа тентовая WIELTON NS3K 2020 г. в., гос. номер А 1449 I-1)	277 084,16
2	Автопоезд с полуприцепом (Автомобиль грузовой седельный тягач MAN TGX 18.460 2018 г. в., гос. номер АМ 8952-1; полуприцеп платформа тентовая WIELTON NS3K 2018 г. в., гос. номер А 8637 Е-1)	241 214,15

Местонахождение предметов торгов – г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2.
Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 24.08.2021 г. 09.00 по 02.09.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

В извещении о проведении публичных торгов в электронной форме по продаже имущества ОАО «ПМК-217», опубликованном в газете «Звязда» от 13.08.2021 г., вносится уточнение в состав предметов торгов и начальную цену

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	Производственная база, общ. площадь 5280,7 кв. м Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея	1 193 070,00
2	Капитальное строение с инв. № 621/С-14125, общ. пл. 592,5 кв. м (здание конторы, Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея, ул. Гагарина, 5	199 000,00

Остальные условия без изменений. Подробнее на beltorgi.by

УНП 600031360

«МЫ ЎСЕ ЛЮДЗІ, І ТРЭБА ЗАЎСЁДЫ ІМІ ЗАСТАВАЦЦА»

«Прывезла дадому шмат станоўчых эмоцый»

Бронзавы медаль. Я, мабыць, яшчэ не да канца зразумела, што ў мяне алімпійскі медаль. Магчыма, гэта і добра, бо я не з тых спартсменаў, хто заканчвае пасля выніку на Алімпіядзе. Таму, мабыць, так і трэба, каб сабрацца і працаваць далей, а не ўзвышаць свой поспех. Я, праўда, не ў поўнай ступені ўсведамляю ўсё, што цяпер адбываецца, але не вельмі на тым зацыкліваюся. Я ўспрымала Алімпійскія гульні як звычайны старт. І так была вялізная псіхалагічная нагрузка, каб яшчэ думаць пра іх статус і значнасць. Але, вядома, мы рыхтаваліся больш старанна. І кваліфікацыя была вельмі жорсткая, па шэсць-сем гадзін, я такога ніколі не праходзіла.

Павышаная ўвага. Я, мабыць, ніколі не адчувала такой цікавасці людзей да сябе. Тое, што ў Мінску я буду нарасхват, зразумела, калі ўбачыла, колькі людзей прыехала сустрэць мяне ў аэрапорт. А потым у палацы мастацкай гімнастыкі мяне чакалі дзеці. І цяпер там усе да мяне ставяцца інакш, дзякуюць, віншуюць, жадаюць поспеху. Гэта фантастычна і надае сіл. Але стомленасць пасля Алімпійскіх гульняў адчуваецца, і таму такая ўвага мяне крыху бянтэжыць, бо да такога я не прывыкла.

Алімпійская вёска. Я не ўдзельнічала ў Еўрапейскіх гульнях, да Токіа не была на Алімпіядзе. Таму я не ведала, што такое Алімпійская вёска. Там такая асаблівая атмасфера. Там сабраліся вялікія спартсмены з розных куткоў планеты. Яны ўсе прайшлі вялікі шлях, каб быць у гэтай вёсцы. Пераважна панаваў спакой, усе былі засяроджаныя на сваіх выступленнях і выніках. Але былі і вельмі пазітыўныя людзі, якія знаёміліся, жадалі поспеху, радаваліся. І гэта стварала такую непаўторную атмасферу! Мне вельмі спадабалася традыцыя абменьвацца значкамі са спартсменамі з розных краін, у мяне ўся акрэдытацыя была ў гэтых значках. У Алімпійскай вёсцы я бліжэй пазнаёмілася з рознымі культурамі і прывезла адтуль шмат станоўчых эмоцый.

Эпідэмічныя абмежаванні. Ужо пяць гадоў летам мы ездзім на збор у Японію. І сёлета, напярэдадні Алімпіяды, мы таксама змаглі туды прыехаць, каб там акліматызавацца, патрэніравацца. Там ужо нават сабраўся наш фанклуб. І вось на зборы абмежаванні былі вельмі жорсткія. Акрамя трэніровачнай залы і гасцінічных нумароў, мы нічога не бачылі, бо нельга было выходзіць. На верхнім паверсе ў невялікім пакоі мы елі, карысталіся службовай лесвіцай. І пасля гэтага абмежаванні Алімпійскай вёскі не здаліся вельмі жорсткімі. І мы, безумоўна, адказна іх выконвалі. Тым больш быў такі насычаны і цесны расклад, што нават думак не было выйсці ў горад.

Японія. За столькі гадоў людзі, якія прымалі нас на зборах, сталі ўжо як родныя. Таму пасля Алімпійскіх гульняў мы затрымаліся ў Японіі. Паехалі ў горад Сіраісі, каб разам з нашымі японскімі сябрамі падвесці вынікі, падзякаваць адно

аднаму. І, зразумела, крыху адпачыць, лепш пазнаёміцца з культурай. Гэта былі своеасаблівыя японскія канікулы, каб расслабіцца. Да Алімпіяды мы з залы не выходзілі зусім, таму адпачынак быў патрэбны. Тым больш што з Японіяй трэба пазнаёміцца. Там зусім іншы свет, свет высокіх тэхналогій і вельмі добрых людзей, вельмі гасцінных. Мне падабаецца гэтая краіна, але гарачыня і вільгаць крыху псуюць уражанне.

«Стужка робіць спаборніцтвы»

Першы нумар зборнай. Мы ў камандзе не дзелімся на першы і іншыя нумары. У нас няма такіх статусаў, і я пра гэта нават не думаю. Гэта больш патрэбна журналістам. Мы з Насцяй Салас ідзём вельмі шчыльна. На адным турніры лепшая я, на іншым — яна. У нас выдатная каманда і аб дзяленні на нумары нават гаворка не ідзе. І я тым больш не думаю, які я нумар.

Скандал вакол першага і другога месца. Мне хапіла абмеркаванняў гэтай тэмы. Вельмі падабаецца жарт у інтэрнэце, «як усе добра разбіраюцца ў мастацкай гімнастыцы, былі ж нармальныя палітыкі». Пераможцаў не судзяць. У Ліной і Дзіны мінімальны адрыў, гэта не катастрафічнае буйное паражэнне. Што здарылася, тое здарылася. У спорце трэба ўмець прайграваць.

Мінімальны адрыў. На чэмпіянаце Еўропы — 2020 я і Ліной Ашрам набралі аднолькавую суму балаў. Па выніках чатырох выступленняў у нас было па 100,9 бала. Некаторыя віншавалі нас абедзвюх з першым месцам. Але на п'едэстале Ліной была першая, я — другая. Суддзі пачалі дасканала вывучаць крытэрыі адзнак. І так атрымалася, што па тых нюансах, аб якіх нават не ўсе ведаюць, яна стала першая. І ў мяне не было ніякай істэрыкі, мяне гэта толькі зрабіла мацнейшай. На Алімпіядзе Ліной да мяне падышла, павіншавала з трэцім месцам, сказала шмат цёплых слоў. Я вельмі адкрыты чалавек і падтрымліваю добрыя адносіны з усімі гімнасткамі, бо мы канкурэнткі толькі на дыване. І нашы слёзы, абдымкі таксама бачыў і абмяркоўваў увесь свет. Мы ўсе людзі і трэба заўсёды імі заставацца.

Стужка. Ірына Юр'еўна Лепарская кажа, што стужка «робіць» спаборніцтвы. І яно сапраўды так. Гэта апошні прадмет у шматбор'і і самы непрадказальны. Ад яе залежыць выніковая адзнака. І на яе ўсё ўплывае — кандыцыянер, вільгаць, спёка — усё. Я ўвесь сезон са сваёй стужкай сябравала. Па выніках чэмпіянату свету, этапаў Кубка свету гэта відаць. І на Алімпійскіх гульнях я выходзіла на выступленне са стужкай спакойная. Але чамусьці яна пажадала памыліцца ў фінале. Кажу ж — непрадказальны прадмет!

Першыя імгненні. Пасля выступлення са стужкай я прыйшла да трэнераў у зону Kiss&Cry вельмі засмучаная, думала, што нават на чацвёртым месцы не буду. І толькі я прысела — мы ўбачылі адзнаку: я была другая, потым трэцяя. Трэнеры пачалі нешта казаць. Там было больш эмоцый, чым слоў. Адразу паліліся слёзы, бо напружанне было вялізнае. Але словы трэнераў няхай застануцца са мной.

«Гэта ўсё заслуга бацькоў»

Дзень нараджэння. 9 жніўня мне споўнілася 20 гадоў. Яшчэ некалькі гадоў таму я нават не марыла, што праваду свой дзень нараджэння ў Алімпійскай вёсцы з медалём. Мяне віншавалі беларуская дэлегацыя, родныя, трэнеры. Потым мы пераехалі ў Сіраісі — і там мяне віншавалі. І калі я прымала віншаванні ў Японіі, у Беларусі мой дзень яшчэ нават не пачаўся. Таму гэта ўсё расцягнулася. Тэлефон узарваўся, закіпеў ад паведамленняў. І я нават да гэтага часу прымаю віншаванні. Нават не магу злічыць, колькі букетаў кветак стаіць дома.

Бацькі. Безумоўна, заслуга бацькоў у тым, што я стала займацца мастацкай гімнастыкай. Гэта іх выбар выпаў на яе. У тры гады я была вельмі актыўным дзіцем, займалася на фартэпіяна, спявала ў хоры і яшчэ мастацкай гімнастыкай займалася. Я сябе ў дзяцінстве амаль не памятаю. Гэта ўсё заслуга бацькоў, бабуль, дзядуль, якія падштурхоўвалі, дапамагалі, матывавалі дзіцятка, падтрымлівалі і вадзілі на трэніроўку за ручку. Фартэпіяна, хор развілі ўва мне музычны слых. У гімнастыцы вельмі важна слухаць музыку, мы ж з ёй увесь час звязаныя.

Сацыяльныя сеткі. У сацсетках ёсць мае фангрупы, імі займаецца сяброўка. Вельмі актыўная суполка «УКантакце», цяпер шмат старонак і ў «Інстаграме». Бывае, што Ірына Юр'еўна хоча скінуць мне нейкую інфармацыю менавіта ў гэтай сацыяльнай сетцы, памыляецца акаўнтам. А на наступны дзень пытаецца, чаму я не паглядзела і не адказала. Вельмі прыемная такая ўвага да мяне, але часам праз гэта кожны мой крок назіраецца і абмяркоўваецца. Я сама шмат часу праводжу ў тэлефоне. Раней хацела зрабіць нешта цікавае ў TikTok. Але зразумела, што тая платформа не для мяне.

Хобі. Яшчэ падчас каранціну палюбіла маляваць, упрыгожваю свае булавы, малюю на адзенні. Перад Алімпіядай малявала талісманы мінулых гадоў. Нядаўна захапілася вышыўкай крыжыкам, гэта добра развівае маторыку рук. Але часу на гэта ўсё, вядома, мала.

Найлепшы антыстрэс. У мяне ёсць мопс Пума. У аэрапорце яна мяне так сустракала, як ніколі. Яна мяне адчувае і ніколі не дае засумаваць. У нас даўно была мара завесці маленькага сабачку ў доме. Усім вядомы каранавірус закрануў і маю сям'ю. Яны былі на каранціне, я ж — у палацы мастацкай гімнастыкі. Мы доўга не бачыліся, і я вырашыла ажыццявіць гэтую мару. Некаторы час Пума пажыла у нас у палацы мастацкай гімнастыкі, — і тут яе любяць і чакаюць. Была для дзяўчынак як антыстрэс. На Новы год, які супадае з днём нараджэння мамы, я падарыла сям'і сабаку. І цяпер мяне тут чакае самы выдатны мопс.

Што далей? Пакуль у мяне невялікі адпачынак. А наперадзе — чэмпіянат свету ў Японіі, не адпускае яна мяне. Затым — падрыхтоўка новых праграм. Трэба вывучыць новыя правілы мастацкай гімнастыкі, яны даволі цікавыя. З задавальненнем буду працаваць далей. Наперадзе Алімпіяда 2024 года ў Парыжы, не так шмат часу засталося. Алімпійскі медаль не зменшыў маю матывацыю. Ніякіх «зорак» я не лаўлю, на нябёсы сябе не падымала. «Бронза» Алімпійскіх гульняў — гэта выдатна, але трэба ісці далей.

Фота НАК Беларусі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наш фармат

МАЛАДЫЯ І РАШУЧЫЯ ШТУРМУЮЦЬ П'ЕДЭСТАЛЫ

Мінулы тыдзень быў багаты на поспехі маладых атлетаў. У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем, якія спартыўныя надзеі цяпер падае моладзь.

Героі тыдня. Беларусы заваявалі пяць медалёў на чэмпіянаце свету сярод юніёраў па лёгкай атлетыцы ў Кеніі. Раман Хартановіч заваяваў «бронзу» ў кіданні дыска. Такі вынік яму забяспечыў асабісты рэкорд — 62 м 19 см. Такі ж медаль у жаночай дысцыпліне ўзяла Аліна Нікіценка. Яна закінула дыск на 51 м 47 см. Марыёла Букель таксама стала бронзавым прызёрам у кіданні молата. У сваёй найлепшай спробе яна закінула снарад на 65 м 20 см. У спаборніцтвах па штурханні ядра Яўген Брыгі стаў сярэбраным прызёрам, паказаўшы вынік у 19 м 70 см. Мацвей Волкаў выйграў «золата» ў скачках з шастом. Пераможны вынік спартсмена — 5 м 45 см.

Лічба тыдня. Чатыры медалі выйгралі беларускія спартсмены на юніёрскім чэмпіянаце свету па барацьбе. Алеся Гетманава, якая выступае ў катэгорыі 55 кілаграмаў, стала чэмпіёнкай свету. «Золата» турніру ў сваёй катэгорыі (97 кг) заваяваў і Павел Глінчук. Сярэбраны медаль выйграла Арына Мартынава (59 кг), бронзавы — Ксенія Дзібук (76 кг).

Рост тыдня. Жаночая тэнісная асацыяцыя апублікавала абноўлены сусветны рэйтынг. Арына Сабаленка ўпершыню ў кар'еры паднялася на другую пазіцыю. На гэтым месцы беларуская тэнісістка пацясніла японку Наомі Асаку. На мінулым тыдні Арына Сабаленка няўдала выступіла на буйным турніры ў амерыканскім Цынцынаці, уступіўшы польцы Паўле Бадосе Хіберт на стадыі 1/16 фіналу. Але Наомі Асака выбыла з барацьбы на наступным этапе — у 1/8 фіналу, і паколькі японка не абараніла свае балы за фінал мінулага года, у рэйтынгу яна адступіла.

Гераіні тыдня. Беларускія спартсменкі сталі пераможцамі чэмпіянату Еўропы па хакеі на траве ў другім дывізіёне. У вырашальным паядынку дзяўчаты перамаглі сапернiц з Францыі з вынікам 1:0. Дзякуючы гэтаму выніку жаночая нацыянальная каманда па хакеі на траве ўпершыню атрымала права выступіць у кваліфікацыі Кубка свету, запланаванай на 1—17 ліпеня 2022 года.

Гульня тыдня. Хакеісты нацыянальнай зборнай Беларусі рыхтуюцца да кваліфікацыйнага турніру Алімпійскіх гульняў.

Кваліфікацыйны турнір да XXIV зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне — 2022 пройдзе ў Славакіі. Сапернікамі беларусаў у адборачнай групе D стануць каманды Польшчы (матч — 26 жніўня), Аўстрыі (27 жніўня) і Славакіі (29 жніўня). Пуцёўкі на Алімпіяду атрымаюць толькі пераможцы кожнай групы.

Турнір тыдня. Нацыянальная жаночая каманда па валейболе ўдзельнічае ў чэмпіянаце Еўропы. Сваё выступленне на кантынентальным першынстве беларускі пачалі з паражэння ад італьянак, вынік сустрэчы — 0:3. У другім матчы беларуская каманда ўступіла камандзе Харватыі з такім жа вынікам. Наступныя матчы ў групавой стадыі чэмпіянату беларускі правядуць супраць камандаў Швейцарыі, Венгрыі і Славакіі.

Надзея тыдня. Зборная Беларусі па пляжным футболе ў сваім другім матчы групавой стадыі чэмпіянату свету прайграла камандзе Швейцарыі. Вынік сустрэчы — 3:7. Напярэдзе ў беларусаў матч з прадстаўнікамі Бразіліі. Цяпер турнірная табліца групы «С» выглядае наступным чынам: 1. Швейцарыя — 4 балы (2 матчы); 2. Беларусь — 1 (2); 3. Бразілія — 0 (1); 4. Сальвадор — 0 (1). На групавым этапе каманды сустракаюцца кожная з кожнай па адным разе, пасля чаго першая і другая зборныя з кожнай групы выходзяць у плэй-оф.

Медалі тыдня. Беларускія каратысты выступаюць на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы па каратэ, які праходзіць у Фінляндыі. Стэфанія Собалева стала бронзавым прызёрам у раздзеле «ката». А «куміціст» Арцём Шаруба (63 кг) падняўся на другую ступень п'едэстала сярод кадэтаў. Ульяна Маркава (48 кг) замкнула тройку лідараў у раздзеле «кумітэ».

Фота з адкрытых крыніц.

Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

Пісьменніцкія вандроўкі

ЦЕНЬ ВЕРТЭРА І САЦ-АРТ У САВЕЙКАХ

Два пункты аднаго рамантычнага сюжэта, якія патрапіліся на нашым шляху, знаходзяцца на адлегласці трыццаці трох кіламетраў.
Палац Рдултоўскіх у Снове гэтым разам мы паглядзелі праз агароджу: дыхтоўны, пад аховай... Белы порцік з велічнымі антычнымі калонамі, выцягнуты на два бакі будынак... Сто сорак метраў даўжынёй, сто пакояў... Яшчэ нядаўна быў тут ваенны шпіталь. Побач цячэ рака Сноўка, мясціны маляўнічыя, захаванасць добрая... Даволі вядомы турыстычны аб'ект.
А вось у другім пункце мы правялі доўгія гадзіны — і таму, што трапілі сюды ўпершыню, і таму, што прыемна пахадзіць у таямнічым месцы, куды мала хто завітвае. Савейкі каля Ляхавіч... Вядомыя як сядзіба Навіцкіх, але быў час, калі і палац у Снове, і палац у Савейках мелі іншых гаспадароў, і сярод іх — Канстанцін Рдултоўскі.

ПЕРАКЛАДЧЫК ШАТА РУСТАВЕЛІ

Розным лёсам кінутыя
на света паводкі,
Сустракаемся мы з табой,
як дзве розныя лодкі!
Твая новая, фарбай і бранёй
зіхацее,
Бісерам вятры хапае,
цячэнне грудзямі разрывае...

Гэты верш пану Канстанціну прысвяціў ягоны сябар Адам Міцкевіч.

Назваў Канстанціна Рдултоўскага, дарэчы, хвацкім паэтам — той пераклаў санеты Міцкевіча на англійскую мову.

Самы час дэкламаваць старасвецкія велягурыстыя вершы, калі шпацыруеш доўгімі-доўгімі прысадамі: клёны, елкі, дубы, некаторыя відавочна бачылі пазамінулае стагоддзе... Дарогу перапаўзаюць смаўжы, іх выцвілыя закручаныя ракавінкі такія хрусткія... Пераступаем уважліва. Наймалодшы чалец нашае вандроўніцкае суполкі, чатырохгадовы Кастусёк, падбягае да кожнага смоўжыка павітацца... Але іх надта шмат — нібыта менавіта па той бок прысады адбываецца смаўжыны баль, варты рызыкі быць раздушанымі...

Чатырыста з паловай метраў прысады выводзяць да сядзібы... Вось яна, бялее ўдалечыні, за травой і кустоўем.... І пераносіць спачатку зусім не ў дзевятнаццатае стагоддзе, а значна пазней. Кіно з падобнымі сюррэалістычнымі пейзажамі здымалі ў 1990-х, адлюстроўваючы канец савецкай эпохі. Калісьці тут былі санаторый, піянерлагер, амбулаторыя... Пра што сведчаць жалезныя шкілеты рэкламных шчытоў і лавак летняга кінатэатра... А таксама скульптура ў модным сёння стылі сац-арт і ў вельмі атмасферным стане: аблупленая, паросłая зялёным імхом. Вось барукаюцца медзведзяняты за бочачку з мёдам... Уздымае рогі вельмі натуралістычны алень, горбіць спіну зубр... Станістая маці трымае кучаравага дзіцёнка — гіпсавая птушачка з яе далоні даўно зляцела...

Апошняя скульптура адметна выглядае на фоне старога дома ў стылі неаготыкі, з плюшчом, што караскаецца на камяні фасада.

Ёсць і скульптура Леніна — рыхтых пасярэдзіне газона, дакладней, «параднага партэра», перад сядзібным домам... Толькі газон дужа заросс, у тым ліку крапівою, а сцежкі да прадыра пралетарыяту ніхто не пратаптаў.

А вось і сам сядзібны дом. Элементы барока, тэраса з балюстрадай, якая абапіраецца на каржакаватыя калоны...

Дарэчы, на гэтым фоне можна паўспамінаць і радкі з паэмы Шата Руставелі «Віцязь у тыгровай скуры». Чаму? Ды таму, што Канстанцін Рдултоўскі перакладаў гэты велічны грузінскі эпас. Ці не ў тутэйшых мясцінах?

Хоць наўрад... Бо фрагмент ягонага перакладу Руставелі быў надрукаваны ў Вільні ў 1831-м, а маёнтак Савейкі пан атрымаў як пасаг сваёй жонкі, Валерыі Незабытоўскай, у 1835 годзе. Незабытоўскія былі суседзямі, Сноў жа непадалёк...

Мусіць, успамінаў савейкаўскі ўладальнік і тую гісторыю, з-за якой не дужа хацелася вяртацца ў бацькоўскі шыкоўны палац у Снове...

ВЕРТЭР-ВУНДЭРКІНД

Пачалася яна яшчэ ў юнацтве... Кола сяброў Канстанціна Рдултоўскага выдатна — усе паэты, Юліюш Славацкі, Эдвард Адынец, Адам Міцкевіч... І Людвіг Шпіцнагель, сын прафесара Віленскага ўніверсітэта. Людвік вылучаўся надзвычайнымі здольнасцямі, ведаў шаснаццаць моў... У тым ліку ўсходнія, што не дзіўна, бо бацька быў па іх спецыялістам. Людвік з Рдултоўскім і пасябраваліся, калі пан Канстанцін раіўся з ім, зусім юным, але ўжо знаўцам, наконт перакладу «Віцязя ў тыгровай скуры». Шпіцнагель нават прысвячаў сябру вершы...

Бацька забраў Людвіка з Віленскага ўніверсітэта, каб не трапіў у непрыемнасці разам з іншымі членамі таварыства філаматаў. Хлапца чакала бліскучая дыпламатычная кар'ера — пасада ў расійскім пасольстве ў Александрыі...

Каб не гасцяванне ў сябра, Канстанціна Рдултоўскага, у Снове... Дзе Шпіцнагель сустрэў сястру Канстанціна, Анелю.

Калі першы раз прыехаў туды, у ліпені 1824 года, яму было сямнаццаць.

Каханне, як належала паэту, было палкае, вечнае... Але неўзаемнае.

Там, у Сноўскім палацы Рдултоўскіх, праз тры гады, Людвік Шпіцнагель і застрэліўся — падобна да ўлюбёнага героя моладзі, гётэўскага Вертэра. Паслаў кулю ў сэрца.

Дарэчы, тая аповесць Гётэ, з'явіўшыся ў 1774 годзе, спарадзіла на дзесяцігоддзі цэлую эпідэмію самагубстваў сярод рамантычна настроеных юнакоў.

Трагедыя ў Снове здарылася ў 1827 годзе. Якраз гэтым годам датуюць узвядзенне там новага палаца. Людвік прыехаў у лютым, неспадзявана... Было яму дваццаць гадоў.

Дарэчы, Людвік вельмі мне нагадвае нашага Сяргея Палуяна, крытыка, які засіліўся ў тым жа ўзросце. Такі ж максімаліст-ідэаліст, паэт з «апантаным сэрцам»...

«Гэта была выдатная кветка, якая не дала плода», — занатаваў у дзённіку паэт Юліюш Славацкі. Самагубства таленавітага паэта і перакладчыка ў пачатку кар'еры стала падзеяй... У мінулым стагоддзі пра гэта стварыў п'есу «Крык рабіны» польскі драматург Вацлаў Кубацкі. Вядома, штось дафантазіраваўшы, і нават зблытаўшы імя гераіні. Канстанцін Рдултоўскі там адзін з галоўных персанажаў.

Наўрад ці сам Канстанцін мог забыць трагічнае здарэнне. Мусіць, і знаходзячыся ў Савейках, распавядаў кранальныя падрабязнасці маладой жонцы.

АДЧАЙНЫ ГУЛЕЦ

Падыходзім бліжэй да сядзібнага дома... Цяпер зразумела, наколькі высокія і магутныя калоны порціка, што падтрымліваюць трэрасу з балюстрадай. Там зручна было, пэўна ж, піць ранішнюю каву... Сёння на трэрасе растуць маладыя дрэўцы. Ускараскаліся яны і на дах, падкінутыя ветрам... На франтоне, над скругленым уверсе акном, — лічбы «1959». Гэта не год пабудовы, а год рэканструкцыі, калі тут зладзілі санаторый лясной гаспадаркі СССР. Зладзілі, кажуць, пасля таго як нашчадак Навіцкіх, польскі амбасадар у Францыі, даслаў грошы на аднаўленне радавога гнязда... Грошы не прынялі, але вырашылі давесці, што ўпарадкуюць сваімі сіламі.

Дарога вядзе да сажалкі — яе берагі зараслі старымі вербамі, на супрацьлеглым беразе рамантычна глядзіцца будынак бровара — у тым жа неагатычным стылі... На бровары лічбы — «1901». Да Канстанціна Рдултоўскага ўжо не мае дачынення... Пан быў натуры, так бы мовіць, творчай, да гаспадаркі не надта здатны. Вось па свецкіх салонах хадзіць... Ягонай траюраднай сястрой, дарэчы, была знакамітая Караліна Сабаньская, у чыім салоне часта бываў і закаханы ў яе Пушкін, і іншыя знакамітасці часу... Бываў і Канстансцін Рдултоўскі. Цягаўся і па іншых свецкіх мерапрыемствах... Дзе любіў сесці за ігральны стол. Ды так завіхаўся, што прайграўся ўшчэнт. Так што мусіў прадаць Савейкі, дакладней, падарыць у кошт пазыкі — уласнаму аканому — Гектару Навіцкаму.

Так і пачалося тут валадараннe Навіцкіх. Дасталіся ім шэсць тысяч гектараў зямлі, бровар, шкіпінарны і смаляны заводы, два вадзяныя млыны.

Мы ідзём па дарозе да вёскі, злева — сажалка і луг, справа — бровар ды іншыя гаспадарчыя будынкі пазамінулага стагоддзя. На лузе, сярод травы, белыя нарцысы... Гэткая стыхійная клумба. Мо тут раней стаяў дом, быў агарод? Ці тут нечая забытая магіла?

Шмат што ўяўляецца, калі наведваеш падобныя мясціны...

Палац у Снове.

Цікавы нюанс: жонка Канстанціна, Валерыя Незабытоўская, была пратэстантка, кальвіністка. І двое дзяцей, якія ў іх нарадзіліся, былі ахрышчаныя ў кальвінісцкай веры. Падобна, што і Канстанцін Рдултоўскі прыняў веру жонкі — бо быў абраны папячыцелем Слуцкай кальвінісцкай гімназіі.

ЯШЧЭ АДНА СЯДЗІБА

Іншая цікавінка: Канстанцін Рдултоўскі нарадзіўся ад шлюбу свайкоў — яго маці была зводная сястра бацькі, Казіміра Рдултоўскага. Жаніх адвалію у Рым вялізныя грошы, каб атрымаць дазвол на вянчанне... І сын Канстанціна, Яўген, ажэніцца са стрыечнай сястрой, Людвікай Рдултоўскай. Ці такія шлюбы былі абмуоўленыя жаданнем захаваць маёнткі ў руках роду, ці проста лёс так складваўся?

Выйшла замуж і Анеля, сястра Канстанціна — за Адама Солтана. Дзяцей не мела.

Прачытала, што малодшы брат Канстанціна Рдултоўскага Яўстафій таксама меў любоў да азартных гульняў...

Каханне, як належала паэту, было палкае, вечнае... Але неўзаемнае. Там, у Сноўскім палацы Рдултоўскіх, праз тры гады, Людвік Шпіцнагель і застрэліўся — падобна да ўлюбёнага героя моладзі, гётэўскага Вертэра. Паслаў кулю ў сэрца.

І тут нечакана намаляваўся трэці эпізод адной сюжэтнай лініі... Мы адправіліся ў яшчэ адзін пункт нашага падарожжа — так званую сядзібу Гартынгаў у Горным Снове. І аказалася, што гэты дом таксама належаў Рдултоўскім — ён перайшоў да Гартынгаў, калі Яўстафій Рдултоўскі, паводле сямейнай легенды, успадчыніўшы ўрэшце ўсю латыфундыю, прайграў у карты барону Густаву Гартынгу свае сноўскія ўладанні — і палац, і сядзібны дом.

Да сядзібнага дома Гартынгі прыбудавалі новы корпус. А стары ўзводзіў Казімір Рдултоўскі, бацька Канстанціна. Так што тут Канстанцін таксама мусіў бываць... І хто ведае, ці не гасцяваў у гэтых сценах і няшчасны Людвік, пакуль будаваўся шыкоўны палац, які стаў месцам ягонай гібелі?

Сёння ў сядзібным доме вядзецца рэстаўрацыя, прынамсі, відаць яе сляды, але да вынікаў яшчэ далёка. Тут быў шпіталь, інтэр'еры, перароблены адпаведным чынам. Ды яшчэ сляды нядаўняга пажару... Столь абвісае лахманамі. Захаваўся хіба камін, аблямаваны кафляй.

У Савейках сёння ціха... Шмат зеляніны, экзатычных дрэваў... Часам проста заснуць. Чытала, што тут збіраліся адкрываць гатэль, ладзіць зоны адпачынку. Што ж, будзем спадзявацца, што і гэтая мясціна ажыве...

А пакуль старую дарогу між прысад перапаўзаюць смаўжы, і кожная кволая, бледная ракавінка ахоўвае цэлы жывы сусвет.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Гатоўнасць № 1!

УСЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА,

або Першы раз у першы клас

Восень не за гарамі, а з ёй і пачатак новага навучальнага года. Сёлета толькі ў Мінску першы раз за парты сядзе амаль 25 тысяч малых. А гэта значыць, што амаль для 25-ці тысяч сталічных сем'яў пачнецца абсалютна новы этап жыцця. Сярод тых, хто вядзе свайго малога «першы раз у першы клас», і вядучая спартыўных навін на «Другім нацыянальным тэлеканале» Марыя Лемешава. Марыя ўпэўненая: чым бы ў будучым ні займаўся яе сын, самае важнае — любіць сваю справу і быць канкурэнтаздольным. І прыкладае шмат намаганняў для выяўлення здольнасцяў хлопчыка. З уласцівымі ёй шчырасцю і гумарам Марыя расказала пра гатоўнасць сям'і да першага Дня ведаў.

Марыя з сынам Янам.

— Марыя, многія бацькі цяпер «шкадуюць» сваіх дзяцей і не вельмі жадаюць аддаваць іх у школу раней за 7 гадоў. Вашаму сыну Яну зараз 6, і вы вырашылі ісці ў першы клас сёлета. Наколькі няпростым было прыняцце гэтага рашэння?

— Калі быць зусім дакладнай, то Яну ўжо 6 гадоў і 8 месяцаў. Шчыра кажучы, я даволі доўга не магла прыняць рашэнне: адпраўляць яго ў школу цяпер ці ўсё ж пачакаць яшчэ год. Але аднойчы, гледзячы на майго раптам пасталелага сына, зразумела, што яшчэ аднаго бесклапотнага года ў дзіцячым садку, хутчэй за ўсё, не прадбачыцца. З іншага боку: чым раней пачне, тым раней скончыць *(смяецца)*.

— Ёсць меркаванне, што хлопчыкі сталеюць пазней за дзяўчат. Якія моманты для вас як для мамы паказвалі, што Ян ужо гатовы сесці за парту?

— Калі ў чалавека ёсць магчымасць выбіраць, то, вядома, лепш пачакаць і не аддаваць дзіця ў школу раней за 7 гадоў. І прычыны тут могуць быць самыя розныя: ад праблем з вымаўленнем асобных гукаў да сіндрому дэфіцыту ўвагі, калі дзецям цяжка канцэнтравацца і яны вельмі хутка пераключаюцца з аднаго віду дзейнасці на іншы. Што датычыцца майго сына, у цэлым, я бачу, што псіхаэмацыянальна, фізічна і ментальна Ян гатовы. Памяняліся зубкі, ростам вышэйшы за сярэдні, можа зрабіць заўвагу і дарасламу чалавеку, калі яны няправільна ставяць націск у словах. Што гэта, як не гатоўнасць да школы? *(Смяецца.)*

— Сёння, ідучы ў першы клас, дзіця, як правіла, можа чытаць, пісаць і лічыць. Наколькі патрэбна так сур'ёзна рыхтаваць малога?

— Я не за тое, каб дзіця, ідучы ў першы клас, умела бегла чытаць і ідэальна пісаць. Дзеля гэтага і існуюць школа і першы клас, і ўсяму свой час. І прыспешваць яго не трэба. Я не кажу, што вывучаць англійскую мову ў 4 гады — гэта дрэнна. Я заўсёды за асэнсаванасць. Шмат чытаючы на гэты конт, я прыйшла да высновы, што, не ведаючы добра сваёй роднай мовы, дзіця не можа глыбока вывучаць мову замежную. Толькі калі ёсць жыццёвая неабходнасць на ёй размаўляць. А валодаць мінімальным замежным «вакабулярам» — гэта, хутчэй за ўсё, асаблівасць дзіцячай памяці, ні больш ні менш. Што датычыцца майго сына, то ён можа чытаць па складах. А вось што выклікае мой асабісты гонар і задавальненне, дык гэта тое, як лёгка яму даюцца азы матэматыкі. Лічу, што такія здольнасці да дакладных навук у яго ад мяне! *(Смяецца.)*

— Раскажыце, як вы рыхтавалі Яна да школы? Можа, наведвалі спецыяльныя заняткі?

— За пару гадоў да школы я вырашыла, што трэба «паднаціснуць» і знайшла для сына цудоўнага педагога, якая змагла не толькі яго падрыхтаваць, але і надаць яму ўпэўненасці ў сваіх сілах, даць тую базу, з якой ён зможа смела ісці вучыцца далей! Былі і заняткі з псіхолагам, крыху з лагапедам, сеансы ў астэапата. Я бачыла значныя змены ў сваім дзіцяці і была вельмі гэтаму радая. Ян стаў больш спакойны, уседлівы, уважлівы. Зніклі капрызы без нагоды. Стала больш выразнае маўленне. Лічу, што ўсё гэта працуе толькі на карысць.

— Як выбіралі навучальную ўстанову для сына? Што было ў прыярытэце?

— Дакладна не статус навучальнай установы быў на першым месцы. Мы пойдзем у звычайную агульнаадукацыйную школу, а не ў гімназію. Чаму? Для мяне як для мамы ў прыярытэце, хутчэй за ўсё, блізкасць да дома і добры настаўнік. Да таго ж гісторыя нашай школы налічвае ўжо больш за 115 гадоў. Акрамя таго, яна з музычным ухілам, так што татавым генам, якія ёсць у сыне, будзе выхад (бацька Яна — Кірыл Кедук — вядомы беларускі піяніст). Я толькі «за»! Мне б хацелася, каб Ян займаўся на якім-небудзь духавым інструменце. Лічу гэты выбар вельмі карысным, асабліва для дыхальнай сістэмы. Калі не атрымаецца, пойдзе па слядах таты.

Марыя ў першым класе.

